Пралетары усіх краёў, злучайцеся!

Зьвязда

№ 17 (3525) Панядзелак, 20 студзеня 1930 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 83.
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, намістаршыня—619, кантора—731.

РАДЫЁ у гадз. ночы:

Ленінскі прызыў у Ангельскай кампартыі

ЛЁНДАН, 19. Да дзён прысьвечаных памяці Леніна, Лібкнэхта і Розы Люксэмбург ангельская кампартыя прыстасоўвае сваю кампанію вярбоўкі новых сяброў кампартыі і камсамолу.

Апошнія навіны **Б. С. С. Р.**

Будаўніцтва Рагачоўска-Жлобінскага агракамбінату

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Паводле данных акркалгассаюзу, раён Рогачоўска-Жлобінскага агракамбінату калектывізаваны на 80 проц. Шырокім тэмпам разгортваецца абагульваньне маемасьці і насенных фондаў. Ідзе будаўніцтва хлявоў для абагуленай жывёлы.

Мабілізуем увагу мас вакол пытаньняў экспарту

Мы павінны зьвярнуць увагу савецкай грамадзкасьці на невыкананьне заданьня ўраду аб узмацненьні загатовак другараднага экспарту. У першым квартале гэтага году **загатоўлена толькі 89 проц. пляну.** Між тым, мы маем рэальную магчымасьць ня толькі выканаць поўнасьцю плянавае заданьне, але і значна **перавысіць** яго. Сотні тысяч рублёў каштоўнай для нас залатой валюты літаральна валяюцца ў нас пад нагамі нескарыстаными. Ініцыятыва месц, грамадзкае пачынаньне можа даць вельмі многае і дапаможа нам выявіць рад новых прадуктаў для экспарту.

Мы ня раз паказвалі на старонках «Зьвязды» на вялікае значэньне прадуктаў другараднага экспарту для эканомікі БССР. Напомнім толькі, што сёлета другарадны экспарт складае каля 23 проц. усяго экспарту (бяз лесу). Па кошце вываз за мяжу другарадных прадуктаў перавышае кошт экспартаванага лесу—важнейшага віду экспарту з БССР.

Чым-жа тлумачацца слабыя вынікі загатовак у першым квартале гэтага году?

У першую чаргу, **няма ўвагі з боку мясцовых арганізацый і грамадзкасьці да гэтага важнейшага участку нашай гаспадарчай работы.** Партыйныя і савецкія арганізацыі не займаюцца пытаньнямі другараднага экспарту. «Мы ня маем часу», «у нашым раёне няма сырцу»—часта заяўляюць райкомы партыі і райвыканкомы. Грамадзкасьць ня прыцягнута да загатовак сырцу для экспарту. На прадпрыемствах не праведзена растлумачальная работа. Рабочы ня ведае, які ўдзел ён можа ўзяць у гэтай справе. Збор адходаў і адкідаў на фабрыках і заводах не наладжаны. Былі нават выпадкі, калі адміністрацыя прадпрыемстваў супраціўлялася пры зборы адкідаў. Толькі ў адным Менску зроблены некаторыя крокі для прыцягненьня грамадзкіх арганізацый да збору прадуктаў другараднага экспарту. У іншых гарадох справа ня зрушылася з мёртвага пункту.

Яшчэ горш, чым у горадзе, пастаўлена растлумачальная работа па вёсцы. Сяляне ня ведаюць выгад ад узмацненьня экспарту.

Трэба зьмяніць мэтады загатовак сырцу для экспарту. Уся работа павінна быць пераведзена на рэйкі грамадзкасьці. Экспартная кампанія—вялікая грамадзкая кампанія. Гэтага нельга забываць ні на мінуту.

БССР мае вялікую патрэбу зараз у трактарах. Плянавы завоз можа задаволіць нашы патрэбнасьці толькі ў нязначных разьмерах. Дадатковае атрыманьне трактараў магчыма толькі пры пасьпяховай мабілізацыі сродкаў пасельніцтва шляхам пашырэньня трактарных абавязацельстваў і звышпляпавай загатоўкай прадуктаў другараднага экспарту. За перавышэньне пляну загатовак другараднага экспарту акругі будуць прэміявацца трактарамі. **«Дай рызьзё, ягады ды косьці — атрымаеш трактар» — вось пад якім лёзунгам трэба праводзіць гэту кампанію.** Гэты лёзунг павінен ведаць кожны калгас, кожны калгасьнік. Гэты лёзунг павінен і можа карыстацца вялікай папулярнасьцю ў нашай беларускай вёсцы і дасьць вялікі эфэкт.

Камсамол, актыўны ўдзельнік усіх нашых масавых кампаній, і ў гэтай кампаніі павінен быць у першых радох. Жанчыны - бяднячкі і серадняцкі—праз жаночыя дэлегацкія сходы таксама могуць быць накіраваны ў паход за экспартным сырцом.

Трэба ўзьняць масы. Трэба абудзіць ініцыятыву мас. Трэба перавесьці ўсю работу **на рэйкі сацыялістычнага спаборніцтва.** Калгас павінен спаборнічаць з калгасам, камсамольскія арганізацыі розных раёнаў адна з аднэй.

Толькі ў такім грамадзкім характары кампаніі—зарука яе посьпеху.

МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСЫ БАТРАЧАК, БЯДНЯЧАК І СЕРАДНЯЧАК НА БЯЗЬЛІТАСНУЮ БАРАЦЬБУ З КУЛАКОМ, НА ЛІКВІДАЦЫЮ КУЛАЦТВА, ЯК КЛЯСЫ

Жанработа на вёсцы--магутны загар калгаснага будаўніцтва

Усім акругкомам і райкомам КП(б)Б

Пасьпяховае разьвіцьцё калгаснага будаўніцтва будзе праходзіць пры ўмовах дераходу «ад палітыкі абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулацтва да палітыкі ліквідацыі яго, як клясы», што выкліча шалёнае супраціўленьне кулацтва мерапрыемствам партыі і імкненьне выкарыстаць слабыя вучасткі партыйна-масавай работы для перашкод калектывізацыі.

Такім спосабам вучасткам партработы яшчэ да гэтага часу зьяўляецца работа сярод батрацка - бядняцка - серадняцкіх мас сялянак. Практыка работы па калектывізацыі вёскі паказвае, што над уплывам кулацкай агітацыі частка сераднячан, нават і бяднячак і асобныя батрачкі тармозяць калектывізацыю сельскае гаспадаркі. Фактаў такіх ёсьць шмат па ўсіх акругах, асабліва ў раёнах масавай і суцэльнай калектывізацыі Прычынай гэтага зьяўляецца часта недаацэнка з боку некаторых парткамітэтаў і вялікай часткі парт'ячэек на вёсцы важнасьці работы сярод сялянак, асабліва зараз пры шпаркім росьце калгаснага будаўніцтва, недаацэнка патрэбнасьці ўзмацненьня работы партыі сярод працоўных жанчын, паляпшэньня гэтай работы ў бок клясавага выхаваньня батрацка - бядняцка - серадняцкіх мас сялянак, мабілізацыі іх да актыўнага ўдзелу ў выкананьні задач па калектывізацыі вёскі і ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Выходзячы з гэтага, ЦК КП(б)Б падкрэсьлівае, што патрэбна зрабіць рашучы пералом у партыйраўніцтве работай сярод батрацка - бядняцка - серадняцкіх мас сялянак, памятаючы, што ад таго, як будзе пастаўлена гэта галіна партработы, будзе запежаць у значнай меры посьпех калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы.

У рабоце сярод бядняцка - серадняцкіх мас жанчын, у справе прыцягненьня іх да актыўнага ўдзелу ў калектывізацыі сельскае гаспадаркі паўстаюць перад партарганізацыяй дзьве задачы: 1) паляпшэньне растлумачальнай работы сярод батрачак, бяднячак і сераднячак, яшчэ не арганізаваных у калгасы, за ўцягненьне іх з усімі сродкамі вытворчасьці ў калгасы, з мэтаю актывізацыі іх на раскулачваньне. 2) Паляпшэньне работы сярод калгасьніц у саміх калгасах для прыцягненьня жаночай часткі калгасаў для актыўнага ўдзелу ў вырашэньні ўсіх задач, зьвязаных з узьняцьцем калгасаў на вышэйшую ступень вытворчасьці (узьняцьцё вытворчасьці, працдысцыпліна, выкананьне пляну пашырэньня пасеўнай плошчы ў калгасах, рост ураджайнасьці, абагульваньне насельня, рабочай і вытворчай жывёлы і г. д.) і да актыўнага ўдзелу ў чыстцы калгасаў ад кулакоў і варожых элемэнтаў.

ЦК КП(б)Б прапануе:

а) Дабіцца большага ўдзелу ўсёй парт-арганізацыі ў справе работы сярод працоўных жанчын: праз АК, РК і парт-ячэйкі дабіцца таго, каб работа сярод працоўных жанчын на вёсцы была асобна вылучана і рашуча палепшана ва ўсіх парткамітэтах і ячэйках, ліквідаваць імкненьні да ўскладаньня гэтай работы толькі на жаноргана і жанработнікаў ячэек; весьці рашучую барацьбу з думкамі, што «вашы жанчыны ў калгасы ня ідуць—гэта ваша работа».

б) Трэба абавязкова праводзіць папярэднюю работу сярод батрачак, бяднячак і сераднячак пры правядзеньні падрыхтоўкі да арганізацыі калгасаў, раскулачваньня і г. д., абавязкова прыцягваючы ўсіх батрачак, бяднячак на агульныя сходы і групы беднаты, а таксама трэба практыкаваць правядзеньне спэцыяльных сходаў бяднячак і батрачак і праводзіць спэцыяльныя жаночыя канфэрэнцыі груп беднаты.

в) Дабіцца яснай і выразнай работы дэлегацкіх сходаў, правядзеньня правільнай клясавай лініі ў іх рабоце на вёсцы і ў напрамку пастаяннай работы па ўцягненьні дэлегатак у распрацоўку мерапрыемстваў і актыўнага ўдзелу ў агітацыі сярод бяднячак і сераднячак у калектывізацыі, веснавой сяўбе, раскулачваньні.

ЗАРАЗ-ЖА ПРЫСТУПІЦЬ ДА АРГАНІЗАЦЫІ ДЭЛЕГАЦКІХ СХОДАЎ У НАНАВА АРГАНІЗАВАНЫХ КАЛГАСАХ, ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ІХ ПАРТКІРАЎНІЦТВАМ.

Асабліву ўвагу ў гэтай рабоце зьвярнуць на сельсаветы, дзе арганізаваны і арганізуюцца нац. і інтэрнацыянальныя калектывы, будуючы масавую работу ў іх пад кутом інтэрнацыянальнага выхаваньня калгасьніц, зжываньня момантаў нацыянальнай варожасьці.

Сакратар ЦК КП(б)Б ВАСІЛЕВІЧ.
Заг. Аддзелам Работніц ЦК КРЭМЭР.

ЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ МеНАК КП(б)Б

На 25-е студзеня, а 6-й гадзіне вечары, у памяшканьні АК, склікаецца чарговы пленум Менскага Акругкому КП(б)Б з наступным парадкам дня:

1) Мерапрыемствы па калектывізацыі сельскай гаспадаркі і падрыхтоўчай працы да веснавой сяўбы.
2) Аб кадрах і вылучэньні рабочых, на кіруючую працу.
3) Аб рабоце сярод беднаты ва ўмовах рэконструкцыі сельскай гаспадаркі.
4) Бягучыя работы і далейшыя мерапрыемствы па сацыялістычным спаборніцтве.
5) Бягучыя справы.

Сакратар АК КП(б)Б СЛАВІНСКІ.

Пралетарыят у капіталістычных краёх у контр-наступленьні супроць сусьветнага капіталізму

Масавыя мітынгі ў Бэрліне супроць забароны дэманстрацый

ЗАПЫТАНЬНЕ КАМФРАКЦЫІ Ў РЭЙХСТАГУ

БЭРЛІН, 18. Учарайшыя 9 мітынгаў, якія арганізаваны кампартыяй у Бэрліне, у адзнаку пратэсту супроць забароны дэманстрацый і канфіскацыі «Ротэ Фанэ», сабралі такую масу рабочых, што многія не маглі зайсьці ў перапоўненую залю. Камуністычныя прамоўцы, у тым ліку т. т. Нэйман, Леаў, Мюнцэнбэрг, Гэшке і інш., пры бурным выказваньні ўхвалы, падкрэсьлівалі, што **кампартыя спакойна, з непахіснаю воляю да барацьбы, легальна або нелегальна павядзе мільённыя масы рабочае клясы на барацьбу з буржуазіяй і прывядзе да перамогі.** Цэнтральнаю задачаю зьяўляецца падрыхтоўка да абвяшчэньня масавае палітычнае забастоўкі. Шматлікія беспартыйныя рабочыя салідарызаваліся ў спрэчках з камуністычнымі прамоўцамі і заявілі аб сваім уступленьні ў рады кампартыі.

Апрача гэтых 9-ці мітынгаў, на шматлікіх заводах Бэрліна таксама адбыліся мітынгі пратэсту. У прынятых рэзалюцыях рабочыя рэзка пратэстуюць супроць увядзеньня стану аблогі і пагрозы забароны кампартыі і заклікаюць рабочых рыхтавацца да палітычнай масавай забастоўкі.

***

БЭРЛІН, 18. Камфракцыя нямецкага рэйхстагу ўнесла запытаньне, каб агульна-нямецкі ўрад неадкладна адмяніў забарону дэманстрацый у Прусіі.

Пленум ЦК швайцарскае кампартыі за пастановы X пленуму Камінтэрну

БЭРЛІН, 19. Пленум ЦК швайцарскае кампартыі, які скончыў сваю працу ў Базэлі, далучыўся да пастаноў X пленуму Камінтэрну і падкрэсьліў правільнасьць захадаў, ужытых у адносінах да сяброў прэзыдыуму Выканкому Камінтэрну, і ў розных сэкцыях Камінтэрну з мэтаю барацьбы з правай небясьпекай. Ва ўхваленай рэзалюцыі ЦК зазначае, што ён лічыць галоўнаю задачаю правядзіць рашучую барацьбу за ліквідацыю превага ўхілу і пазбавіць партыю ад усіх антыпартыйных элемэнтаў. Пленум рашыў, што 30-га сакавіка трэба правесьці міжнародны чырвоны дзень барацьбы з фашызмам.

Бой з паліцыяй за прафсаюзны дом

ВЕНА, 18. Паводле вестак з Бухарэсту, у Таргумуры 16-га студзеня вечарам звыш 200 рабочых, выключна моладзі, членаў унітарнага прафсаюзу, увайшлі ў дом унітарных прафсаюзаў, які быў апячатаны месяц таму назад уладаю. Рабочыя, сарваўшы пячаці, захапілі памяшканьне. Паліцэйскія акружылі дом, але рабочыя абаранялися. Адбылася сутычка, у ход была пушчана агнястрэльная зброя. Паранены 30 рабочых і 50 паліцэйскіх. Толькі пасьля доўгае барацьбы моцнаму атраду паліцэйскіх удалося выгнаць рабочых з дому прафсаюзаў і зноў яго апячатаць. 37 рабочых арыштаваны.

БАРАЦЬБА ВУГЛЯКОПАЎ У ЖЫЛАВЕ

ВЕНА, 18. У раёне Жылавы пашыраецца стачка вугляко́паў. Апрача таго, налаўчора забаставалі рабочыя раду прадпрыемстваў у горадзе Лівазэні (не вялікі прамысловы горад у Румыніі) Аднак, забастоўка на наступны дзень была задушана жандарамі. Паводле вестак семіградзкіх газэт, у даліне Жылавы адбываюцца масавыя арышты бастуючых, якіх жорстка зьбіваюць у сыгуранцы, а некаторых рабочых катавалі косамі. Ня гледзячы на тэрор, забастоўка ў розных пэхах выплывае адна за другою.

Сваёй агітацыяй за фашысцкую дыктатуру буржуазны друк заклікае ўрад да выключных мер супроць камуністых і патрабуе ўступіць месца ўраду моцнае рукі.

15.000 ГАРНЯКОЎ БАСТУЮЦЬ У ПЭРУ

НЬЮ-ЁРК, 19. Паводле паведамленьняў з Пэру, 15 тысяч рабочых на капальнях па здабычы медзі, якія належаць амэрыканцам, абвясьцілі забастоўку, патрабуючы павялічэньня заработку. Забастоўка сарвана рэфармістымі, якія разам з прадстаўнікамі ўлады панадавалі гарняком хлусьлівых абяцанак. Сотні рабочых арыштаваны і высланы з межаў Пэру.

ЗАБАСТОЎКА Ў ШКЛЯНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ЧЭХА-СЛАВАКІІ

ПРАГА, 19. Уласьнікі гутаў у Ніжнім Рыхнове і Алове звольнілі тысячу рабочых, пераважна сяброў чырвонага саюзу шкляроў. Рабочыя абодвых заводаў абвясьцілі забастоўку. Кампартыя заклікала рабочых абярнуць распачатую стачку ва ўсеагульную забастоўку ўсіх рабочых шкляной прамысловасьці з мэтаю барацьбы супроць капіталістычнае рацыяналізацыі і супроць яе абаронцаў сацыял-фашыстых.

ЗАБАСТОЎКА ГАРНЯКОЎ У АМЭРЫЦЫ

НЬЮ-ЁРК, 19. У штаце Ілінойс распачалася забастоўка 1.100 гарнякоў. Рэфармісцкія лідэры саюзу абвясьцілі забастоўку «незаконнай» і пачалі вербаваць штрэйкбрэхэраў.

СЛУЖАЧЫЯ Ў НЬЮ-ЁРКУ ЗАБАСТАВАЛІ

НЬЮ-ЁРК, 19. Служачыя і рабочыя некаторых нью-ёрскіх прадуктовых рынкаў абвясьцілі забастоўку, патрабуючы павялічэньня заработку, скарачэньня рабочага дня і прызнаньня саюзу. Забастоўка праходзіць пад кіраўніцтвам левага саюзу харчавікоў. У часе мітынгу бастуючых паліцыя разагнала ўдзельнікаў, распачаўшы страляніну і параніўшы аднаго рабочага — члена кампартыі.

ЗА МОПР'АЎСКУЮ ПРАЦУ — 6 МЕСЯЦАЎ ТУРМЫ

НЬЮ-ЁРК, 19. Паводле паведамленьня з Гастоніі (штат Паўночная Караліна), арганізатар МОПР'у ў паўднёвых штатах Сауль засуджаны на 6 месяцаў астрогу па абвінавачаньні ў падбухторваньні да мецяжу. Сауль быў арыштаваны ў лістападзе, пасьля выступленьня на мітынгу тэкстыльшчыкаў.

Жахлівы голад у Кітаі

2 МІЛЬЁНЫ ЖЫХАРОЎ ЗАГІНУЛІ

ЛЁНДАН, 19. Як паведамляюць з Пэйпіна, там апублікаваны даклад упоўнаважанага міжнароднае камісіі па дапамозе галадуючым у Кітаі па абсьледваньні цэнтральнае часьці Шансійскае правінцыі, якая ахоплена голадам.

За апошні год з 6-ці мільёнаў насельніцтва раёну памерла ад голаду 2 мільёны. Упоўнаважаны камісіі, які быў у галадуючым раёне, лічыць, што яшчэ 2 мільёны чалавек пакінуты на галодную сьмерць. Раён голаду ахапляе тэрыторыю ў 5.000 кв. міль. Насельніцтва ня мае ніякіх харчавых запасаў. Многія харчуюцца лісьцямі і карою з дрэў. **Кожны дзень наглядаюцца выпадкі продажу дзяцей.** Становішча раёну пагаршаецца яшчэ тым, што тут знаходзяцца 300.000 войск гоміньдзюна (Фыньюйсянаўскае войска).

Супроць капіталістычнае рацыяналізацыі

МАСАВЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ ЧЫГУНАЧНІКАЎ У ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ, 18. У дзяржаўных чыгуначных майстэрнях парыскага вузла разгортваецца барацьба рабочых супроць узмацненьня рацыяналізацыі, якія праводзіцца за лік рэальнае зарплаты. Паводле прыкладаў рабочых майстэрань Ля-Гарэн (якія некалькі раз адказвалі італьянскаю забастоўкаю на спробы дырэкцыі ўвесьці ўзмоцнены хранаметраж), рабочыя чыгуначных майстэрань Левалуа і Батыньоль арганізавалі масавыя дэманстрацыі перад будынкам праўленьня чыгункі. Учора-ж, па скончэньні працы, 1.200 рабочых майстэрань Батыньоля дэманстравалі на вуліцах супроць капіталістычнае рацыяналізацыі. На арганізаваным пасьля дэманстрацыі мітынгу рабочыя прынялі лёзунгі унітарнага прафсаюзу аб узмацненьні і аб'яднаньні барацьбы ўсіх чыгуначнікаў парыскага раёну за павялічэньне зарплаты і супроць капіталістычнай рацыяналізацыі.

ПАРЫЖ, 19. Міжсаюзны камітэт унітарных прафсаюзаў дзяржаўных рабочых і служачых паштавікоў, камунальнікаў і чыгуначнікаў склікаў 2 мітынгі пратэсту супроць алмовы ўраду павялічыць заработак рабочым і ніжэйшым служачым. Урад забараніў наладжваць мітынгі ў памяшканьні біржы працы, пасьля чаго некалькі тысяч рабочых і служачых перанесьлі мітынг у дом унітарных прафсаюзаў.

Выступаўшы на мітынгу Кашэн, спатканы з уздымам, вітаў заснаваньне міжсаюзнага камітэту, які гуртуе барацьбу ўсіх катэгорый дзяржаўных служачых і рабочых, і заклікаў служачых аб'яднацца пад кіраўніцтвам партыі і унітарных прафсаюзаў. Прыхільнік апартуністычнае меншасьці Лева, які прабаваў выступіць на мітынгу, быў асьвістаны і пакінуў залю пад выгукі: «прэч апартуністых і рэнэгатаў!» Пасьля аднагодзіна прынятае рэзалюцыя якая ўхваляе лінію кампартыі і унітарнае канфэрэнцыі працы, мітынг скончыўся пяяньнем «Інтэрнацыяналу».

Мітынгі аб мэнанітых у Бэрліне

40 трактараў сацыялістычнаму будаўніцтву СССР

БЭРЛІН, 18. За апошнія дні Міжрабном правёў у Бэрліне з масавыя мітынгі для азнаямленьня бэрлінскіх рабочых мас з сапраўдным становішчам мэнанітых-кулакоў, якія эмігравалі з СССР і знаходзяцца ў сучасны момант у нямецкіх канцэнтрацыйных лягерох. Усе мітынгі былі надзвычайна шматлюдныя

З дакладам выступіў рэдактар газэты аўтаномнае рэспублікі немцаў Паволжжа тав. Рыхтэр, які апісаў становішча беднякоў Паволжжа да Кастрычнікавае рэвалюцыі і падкрэсьліў гаспадарчыя і палітычныя заваёвы іх пры ўладзе саветаў. Тав. Рыхтэр зазначыў, што **ні ў адной капіталістычнай дзяржаве пытаньні нацыянальных меншасьцяй ня вырашаны з такой поўнасьцю і так бліскуча, як у СССР.** Большасьць эмігравуўшых з СССР нямецкіх сялян—кулакі, якія супраціўляліся калектывізацыі.

На мітынгах было паведамлена аб арганізацыі збору сродкаў Міжрабпому на набыцьцё 40 трактараў для сацыяльнічаньня сацыялістычнаму будаўніцтву СССР. Бэрлін-Брандэнбурская арганізацыя Міжрабпому абавязалася сабраць сродкі на 2 трактары. Пачаты на мітынгах збор, даў бліскучыя вынікі.

Тайная фашысцкая арганізацыя ў Швэцыі

СТАКГОЛЬМ, 17. «Сац. Дэмакратэн» публікуе сэнсацыйнае паведамленьне аб існаваньні строга канспіраванай узброенай фашысцкай арганізацыі, галоўнаю мэтаю якое зьяўляецца барацьба з камуністымі. На чале арганізацыі стаяць афіцэры былога камандаваньня. «У распаряджэньні арганізацыі,—піша газэта,—маюцца кулямёты, 3-4 тысячы маўзэраў вайсковага ўзору, якія дастаўлены з Нямеччыны шведзкім афіцэрам інжынэрных войск. Адзяленьне арганізацыі, на чале якога стаіць афіцэр, знаходзіцца таксама ў Гётэборгу. Арганізацыя фінансуецца банкірамі». Газэта паказвае нават месца, дзе адбываюцца заняткі арганізацыі.

Лічачы ўдзел афіцэраў у гэтай арганізацыі вялізарным скандалам, «Сац. Дэмакратэн» патрабуе ад паліцыі тэрміновага расьсьледваньня. Лібэральная «Стакгольм Тыднінгэн», не адмаўляючы існаваньня падобнай арганізацыі, лічыць, што яна створана ў процівагу саюзу чырвоных франтавікоў, які быццам існуе ў Швэцыі.

Толькі шляхам узброенага паўстаньня працоўныя З. Б. заваююць свае правы

(З ПРАМОВЫ ПАСЛА ГАЎРЫЛЮКА Ў ПОЛЬСКІМ СОЙМЕ

ВАРШАВА, 18. У часе соймавае дыскусіі з прычыны праграмнае прамовы прэм'ера выступіў прадстаўнік беларускага рабоча-сялянскага блёку дэпутат Гаўрылюк. Характарызуючы новы ўрад, «які прыйшоў пасьля разыграванае сацыял-фашыстымі камэдыі», Гаўрылюк падкрэсьлівае, што асоба Бартэля не зьяўляецца новаю.

— Гэта той самы Бартэль,—заўважае Гаўрылюк,—якога Пілсудскі назначыў прэм'ерам неадкладна пасьля свайго крывавага перавароту. Для мас Заходняе Беларусі (крыкі з месц: «Якая такая яшчэ Заходняя Беларусь, такія назвы забаронены») гэта той самы Бартэль, які заліў крывёю беларускія землі (вялікі шум). Гэта пры Бартэлі паліцыя расстрэльвала з кулямётаў няўзброеных беларускіх дэманстрантаў. Гэта пры Бартэлі ў Косаве было забіта 6 сялян і паранена 53, а пасьля яшчэ польскі суд судзіў пакалечаных сялян. Косаўская трагэдыя крывёю запісана ў сэрцы кожнага беларуса (моцны шум, крыкі: «Што гэта яшчэ за Заходняя Беларусь, няма такіх назваў»). У царскія часы,—усклікае Гаўрылюк,—ня было Польшчы, быў толькі Прынісьлінскі край. Зараз-жа ў Польшчы **няма Заходняй Беларусі, ёсьць толькі Усходнія Красы.**

Пералічваючы рэпрэсіі ў Заходняй Беларусі, Гаўрылюк прыпамінае свае словы, кінутыя ў свой час па адрасе Бартэля. «Вы будзеце душыць, зьнішчаць, заключаць у турмы». **Такі праграмны лёзунг буржуазнае Польшчы ў адносінах да нацыянальных меншасьцяй і пралетарыяту** (моцны шум, выкрыкі). Нас абвінавачваюць у нелояльнасьці. Так, мы нелояльны ў адносінах да фашысцкае дыктатуры, але мы лёяльны ў адносінах да працоўных мас Польшчы. **Лёяльнымі ў адносінах да ўраду зьяўляюцца толькі здрадніки беларускага народу,** якія купілі фашысцкія міласьці паною адрады сваіх таварышоў з Грамады, цаною выкіданьня сотняў беларускіх вучняў са школ, цаною правакацыі. Такое «лёяльнасьці» ўрад не дачакаецца ад 2-х мільённае масы Зах. Беларусі. Рука-аб-руку з фашыстымі ідуць сацыял-фашыстыя і буржуазныя згоднікі з колаў нацыянальных меншасьцяй. Усё гэта будзе працягвацца да тае пары, пакуль масы ня ўзьнімуцца і **шляхам узброенага паўстаньня не заваююць сваіх правоў** (страшэнны шум, крыкі, воплескі на лаўках рабоча-сялянскага блёку).

Яўрэйскія сацыял-фашыстыя (бундаўцы) „працуюць"

За апошні час вельмі абвастрылася барацьба паміж левымі рабочымі і штрайкбрэхэрамі—членамі саюзу мэталістых, які знаходзіцца пад кіраўніцтвам «Бунду». Бундаўскі орган «Фолксцайтунг» адкрыта выдае левых рабочых у рукі паліцыі, называючы прозьвішчы рабочых і абвінавачваючы іх у тэроры.

Яскравым прыкладам таго, наколькі абвастрылася барацьба левых рабочых з бундаўскімі штрайкбрэхэрамі, зьяўляецца бойка, якая адбылася ў Варшаве, у саюзе мэталістых. У часе гэтае бойкі, якая пачалася з прычыны разгалосьсяў у сувязі з канфліктам на адной фабрыцы, бундаўцы стралялі з рэвальвэраў у рабочых.

Рабочыя дэманстрацыі супроць сіяністых-яўрэйскіх агентаў фашызму

Сіяністыя ў Польшчы, якія зьяўляюцца агентурай польскага фашызму і ангельскага імпэрыялізму таксама, як і польскія фашыстыя, вядуць узмоцненае цкаваньне Савецкага Саюзу. Гэтымі днямі яны склікалі ў Лодзі мітынг «пратэсту» супроць «прасьледваньня яўрэяў у Савецкай Расіі».

На мітынг нячакана для саміх яго арганізатараў прыйшло шмат рабочых, якія прамоўцам не давалі гаварыць.

У той-жа час перад будынкам, у якім адбываўся мітынг, сабралася вялізарная маса польскіх яўрэйскіх рабочых, якія дэманстравалі супроць цкаваньня Савецкага Саюзу. У будынку павыбіты ўсе шыбы.

Таксама ў Варшаве апошнімі днямі адбылося шмат дэманстрацый рабочых, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі супроць сіяністых.

Гэтымі днямі, у часе канфэрэнцыі прадстаўнікоў друку, скліканае сіяністкай арганізацыяй, адбыліся дэманстрацыі кала гасьцініцы «Брыстоль», перад будынкам рэдакцыі сіяністкае газэты «Наш Шпэтглёнд» і інш. Дэманстранты прайшлі з лёзунгамі супроць фашысцкае дыктатуры, супроць яе сіяністкіх агентаў, за Савецкую ўладу ў Польшчы. Пашыраліся адозвы кампартыі. Паліцыя, якая была мабілізавана для абароны сіяністкае канфэрэнцыі, разганяла і зьбівала рабочых.

Новы завод атрутных газаў

У Мосьціцах зараз пушчаны ў ход новапабудаваны завод удушлівых газаў, які зьяўляецца адным з самых буйных у Польшчы. Пабудова яго гэта—адно з важнейшых мерапрыемстваў па падрыхтоўцы вайны супроць Савецкага Саюзу.

На адчыненьне заводу выехаў прэзыдэнт польскае рэспублікі, старшыня ўраду і галоўныя «гэрої дня»—розныя прадстаўнікі арміі, вайсковага міністэрства і інш.

Канікулы—экзамэн студэнцтву

Ва ўсіх вышэйшых навучальных установах Саюзу зараз надыходзяць зімовыя канікулы. Сотні студэнтаў прыедуць у межы Беларусі з іншых рэспублік. Яшчэ большая колькасьць разьедзецца па вёсках слухачоў беларускіх ВНУ.

Прабываньне студэнцтва на вёсцы і ў горадзе павінна даць пэўныя практычныя вынікі ў справе ажыцьцяўленьня задач, пастаўленых партыяй і савецкай уладай на бліжэйшы пэрыяд. Гэтае пытаньне павінна быць пастаўлена са ўсёю бальшавіцкаю рашучасьцю.

Трэба проста сказаць, што работа таго або іншага таварыша за час канікул павінна стаць адным з важнейшых крытэрыяў пры ацэнцы яго, як пралетарскага студэнта. Мы павінны да кожнага таварыша прад'явіць жорсткае патрабаваньне паказаць сваю здольнасьць адпавядаць тым запатрабаваньням, якія зараз высоўвае жыцьцё — уменьне ажыцьцявіць свае веды, якія яны атрымалі на практычнай рабоце, уменьне стаць арганізатарам сацыялістычнага будаўніцтва. Ні адзін студэнт не павінен застацца ў баку ад вялікае будоўлі, якая захапіла ўсе куткі нашае рэспублікі, ні адзін студэнт ня можа застацца пасыўным глядачом вялікае творчае работы, якая разгарнулася.

Гэтага патрабуе ўся сучасная абстаноўка нашае працы. Студэнт перш за ўсё павінен стаць памоцнікам мясцовых партарганізацый у практычнай працы па ліквідацыі кулацтва, як клясы. Студэнт павінен стаць ініцыятарам і арганізатарам калгаснага руху. У першую чаргу пытаньне аб калектывізацыі ён павінен паставіць у адносінах свае гаспадаркі.

Шырокім полем дзейнасьці зьяўляецца работа па падрыхтоўцы да веснавое сяўбы. У гэтай справе кожны студэнт павінен выказаць сябе ініцыятарам і дарадцам.

Нарэшце, да важнейшых задач адносіцца ўдзел студэнцтва ў трохмесячніку беларускай і нацменаўскай культуры, які зараз праводзіцца.

Вось кола асноўных пытаньняў студэнцтва ў часе канікул.

Перад мясцовымі партарганізацыямі стаіць задача рацыянальнага скарыстаньня гэтых кадраў і ўсямернай дапамогі новаму папаўненьню на асноўных вучастках свае работы.

Партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі ВНУ распрацаваны рад практычных мерапрыемстваў па пытаньні адпаведнага скарыстаньня зімовых канікул. Трэба дабіцца стопроцантнага іх выкананьня.

Дружна за работу! За канкрэтныя вынікі, за практычныя дасягненьні!

Арганізаваць масавую праверку індывідуальнага абкладаньня

У апошні час па БССР выяўлена 18,5 тысяч кулацкіх гаспадарак, што складае 2,3 проц. да ўсіх гаспадарак. Мінімальна-арыентовачныя лічбы для індывідуальнага абкладаньня, такім чынам, выкананы. Але побач з гэтым, ёсьць шмат фактаў, якія сыгналізуюць вялікую небясьпеку ў гэтай галіне.

Праверка індывідуальнага абкладаньня кулацкіх гаспадарак, якая зроблена ў двух раёнах БССР, сьведчыць аб тым, што ёсьць яшчэ шмат кулакоў, якія ня прыцягнуты да індывідуальнага абкладаньня, а пакуль што абкладзены ў звычайным парадку.

Другі, ня менш важны недахоп, аб якім таксама гаворыць факты абсьледваньня, гэта — паасобныя выпадкі памылковага абкладаньня ў індывідуальным парадку серадняцкіх гаспадарак.

Акруговыя падатковыя камісіі зьяўляюцца апошняй інстанцыяй для вырашэньня ўсіх скаргаў па сельгаспадатку і ў тым ліку па індывідуальна-абкладзеных гаспадарках. Між тым, гэтыя камісіі ня досыць рашуча выяўляюць усе факты, якія сьведчаць аб памылковасьці абкладаньня.

Масавая праверка, якая зараз праводзіцца па ўсіх акругах, павінна выявіць сапраўдных кулакоў, якія яшчэ да гэтага часу не абкладзены ў індывідуальным парадку, і выправіць памылкі з абкладаньнем серадняцкіх гаспадарак.

Акрамя гэтага, прыдзецца ў часе праверкі зьвярнуць шмат увагі своечасовасьці выплаты сельгаспадатку і самаабкладаньня кулацкімі гаспадаркамі, за якімі ёсьць яшчэ вялікая запазычанасьць у асобных акругах. Вось, напр., Гомельшчына. На 10-і кулакі павінны былі заплаціць 530 т. р. сельгаспадатку, а заплацілі—190 т. руб. У гэтай акрузе ёсьць раёны, дзе кулакі заплацілі ўсяго 86 проц. падатку (Буда-Кашалёўскі і Гомельскі).

Па самаабкладаньні ў кулакоў гэтай акругі застаюцца на руках сотні тысяч рублёў. Ёсьць раёны, якія выканалі самаабкладаньне на 10-і усяго на 5 проц. (Хойніцкі раён) і 14 проц. (Рэчыцкі раён).

У гэты час, калі ў парадку дня стаіць задача ліквідацыі кулацтва, як клясы, вялікая запазычанасьць за кулакамі зьяўляецца недапушчальным зьявішчам, з якім трэба весьці самую рашучую барацьбу.

У часе праверкі трэба выявіць у усе даходы кулацкіх гаспадарак, якія павінны быць абкладзены падаткам. Тут трэба разьлічыць два моманты: паўнату выяўленьня даходаў кулацкіх гаспадарак і правільнасьць абкладаньня гэтых даходаў падаткам. Факты сьведчаць аб тым, што даход кулацкіх гаспадарак вызначаецца вельмі «асьцярожна» і часта прыцягваюцца да абкладаньня, як даход серадняцкіх гаспадарак (замест 100 проц.—35 проц. і 50 проц.).

На масавую праверку індывідуальнага абкладаньня цэнтральныя ўстановы (НКФ) кінулі ўсе лепшыя сілы. Таксама павінны безадкладна зрабіць акруговыя ўстановы

Уся праверка павінна весьціся ў баявым парадку; да актыўнага ўдзелу ў праверцы павінны быць прыцягнуты ўсе савецкія і партыйныя ўстановы, савецкая грамадзкасьць і бяднацкая частка вёскі.

Па Савецкім Саюзе

Будуем сацыялістычную гаспадарку

**НА РЭЙКІ СУЦЭЛЬНАЕ КАЛЕКТЫ

Аб сацыялістычнай рэканструкцыі і задачах КП(б)Б па ўзмацненьні падрыхтоўкі і вылучэньня кадраў

Даклад тав. ГАНТМАНА на студзеньскім пленуме ЦК КП(б)Б*)

Праблема кадраў—рашаючая праблема сацыялістычнага будаўніцтва

У розныя рашаючыя этапы разьвіцьця нашае партыі пытаньне аб кіраўнічых партыйных кадрах ставілася ва ўсім сваім вялізным значэньні.

У першыя гады, калі складалася і фармавалася наша партыя, Уладзімер Ільіч Ленін высоўваў в усёй сур'ёзнасьцю пытаньне аб стварэньні кадраў прафесыянальнаў-рэвалюцыянэраў, якія маглі-б забясьпечыць кіраўніцтва партыяй.

На працягу ўсёй гісторыі разьвіцьця нашай партыі ў розныя пэрыяды, у пэрыяды змаганьня з меншавізмам, з апартуністычнымі меншавіцкімі плынямі, зноў і зноў ставілася пытаньне аб кадрах. У перадкастрычніцкія дні Уладзімер Ільіч таксама высоўваў з усёй вострасьцю пытаньне адносна стварэньня кіраўнічых кадраў.

У рашаючы пэрыяд пераходу да НЭП'у пытаньне аб кадрах таксама ставілася ва ўсёй сваёй шырыні.

І зусім невыпадкова, што барацьба рознага роду апазыцыйнай супроць бальшавіцкай лініі партыі ідзе таксама па лініі кіраўнічых кадраў. Вы памятаеце, як трацкістыя ў свой час высоўвалі тэорыю адносна разлажэньня кіраўнічых кадраў, іх пераражэньня, супроцьставячы маладыя кадры старым бальшавіцкім кадрам. Партыя дала рашучы адпор гэтым атакам контр-рэвалюцыйнага трацкізму супроць бальшавіцкай лініі партыі па пытаньні аб кадрах.

Правыя апартуністы таксама атакавалі партыю па лініі кіраўнічых кадраў, змазваючы значэньне кіраўнічых кадраў, паказаўшы поўнае пераўменьне ўсяго палітычнага значэньня кіраўнічых кадраў. Партыя таксама дала моцны адпор правым апартуністым у гэтым пытаньні. Антыпартыйная, небальшавіцкая ўстаноўка правай апазыцыі аб кіраўнічых кадрах проста вынікае з апартуністычнай тэорыі правых аб аслабленьні тэмпу індустрыялізацыі, тэмпу разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва, калектывізацыі, з пераразуменьня працэсаў клясавай барацьбы. Проста вынікае з апартуністычнай антыленінскай тэорыі правых па пытаньні аб клясавай барацьбе. Пытаньне аб кіраўнічых кадрах ва ўсе пэрыяды і асабліва ў гэты пэрыяд абвостранай клясавай барацьбы ёсьць пытаньне адносна ўмацаваньня кіраўнічых пазыцый пралетарыяту, ёсьць пытаньне забесьпячэньня рашучага і пасьпяховага наступленьня на капіталістычныя элемэнты, пасьпяховага ажыцьцяўленьня рашучага курсу партыі на выкарчоўваньне рэштак капіталізму.

У нашых умовах напрэспублікі нацыянал-дэмакратычныя і шавіністычныя элемэнты як у нашых радох, так і паза нашай партыяй таксама атакуюць цалітычную лінію партыі ў пытаньні аб кіраўнічых кадрах.

Абвінавачаньні і атакі супроць партыі зводзяцца да таго, што партыя вядзе няправільную лінію ў адносінах кадраў, ня ставіць сур'ёзна пытаньня аб падрыхтоўцы кіраўнічых кадраў з карэнных нацыянальнасьцяй.

ЦК партыі і ўся КП(б)В выкрыла ўжо даўно падаплёку гэтага агіднага паклёпу супроць правільнай бальшавіцкай лініі КП(б)В у гэтым пытаньні.

Ставячы пытаньне адносна таго, што партыя вядзе няправільную лінію ў адносінах падрыхтоўкі кіраўнічых кадраў, нацыянал-дэмакратычныя і шавіністычныя элемэнты, гэта для ўсякага цалкам зразумела, маюць на ўвазе не падрыхтоўку і вылучэньне пралетарскіх кадраў, а кадраў дробна-буржуазных з нацыяналістычнай інтэлігенцыі. Партыя і надалей будзе весьці рашучую барацьбу і дасьць адпор усякаму, хто будзе прабаваць бальшавіцкай лініі партыі ў пытаньні аб пралетарскіх кадрах процістаўіць сваю апартуністычную лінію.

У цяперашні пэрыяд пытаньне аб кіраўнічых кадрах мае асабліва вялікае значэньне. Грандыёзныя задачы сацыялістычнага будаўніцтва, пэрыяд сацыялістычнай рэканструкцыі, вялізарнейшыя задачы ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі прад'яўляюць партыі вялікія патрабаваньні на кіраўнічыя кадры, патрабаваньні ў адносінах падрыхтоўкі і вылучэньня новых тысяч і дзесяткаў тысяч арганізатараў, кіраўнікоў нашае сацыялістычнае гаспадаркі.

Уся наша работа, нашае будаўніцтва па перабудове сельскае гаспадаркі на сацыялістычны лад, вялікія задачы ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва узьнімуць культурнага ўзроўню шырокіх мас працоўных — адбываюцца ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы і таму, у цяперашні пэрыяд больш, чым калі-б там ні было, пытаньне аб умацаваньні кіраўнічых кадраў зьяўляецца пытаньнем падвойна палітычным, якое мае буйнейшае палітычнае значэньне.

Год работы па падрыхтоўцы і выхаваньні новых кіраўнічых пралетарскіх кадраў

Я хачу даць некаторую характарыстыку і аналіз тэй рабоце, якая праведзена КП(б)Б па падрыхтоўцы кіраўнічых кадраў.

Падам некаторыя даныя, якія зьвяцца лепшым адказам на ўсе атакі супроць лініі партыі ў справе падрыхтоўкі кіраўнічых кадраў, на атакі права-апартуністычнай апазыцыі, лепшым доводам супроць нацыянал-дэмакратычных і шавіністычных элемэнтаў, якія выступаюць супроць лініі партыі ў абсягу падрыхтоўкі кіраўнічых пралетарскіх кадраў. За мінулы год партыя дабілася вялікіх вынікаў у абсягу выхаваньня, у абсягу выкоўваньня новых кіраўнічых пралетарскіх кадраў. Нам удалося ўмацаваць савецкі апарат, арабочыць рад савецкіх органаў. У цэлым радзе савецкіх органаў удзельная вага рабочай праслойкі з году ў год нязьменна расьце. За мінулы год мы падрыхтавалі шырокі кадр кіраўнікоў нашай сацыялістычнай прамысловасьці—чырвоных дырэктароў на прадпрыемствах, намесьнікаў, кіраўнікоў буйнейшых цэхаў з асяродзішча вытрыманых, перадавых, лепшых пралетараў, партыйцаў, якія прайшлі грунтоўную пралетарскую рэвалюцыйную школу.

Мы дабіліся поўных вынікаў у абсягу падрыхтоўкі новых пралетарскіх кадраў спэцыялістых і культурных работнікаў. Я падкрэсьліваю, што гэта першыя дасягненьні, ящчэ вельмі нязначныя.

У нашых партыйных кіраўнічых кадрах па сацыяльным складзе пленуму ЦК, акруговых камітэтаў партыі мы маем рабочых 60,4 проц., служачых — 16,9 проц., сялян — 21,7 проц.

У складзе кантрольных органаў сацыяльны склад кіраўнічых кадраў ящчэ лепшы: рабочых у складзе пленуму ЦКК і АКК — 64,8 проц. У складзе сакратароў райкомаў рабочых—51,8 проц.

Па лініі прафэсыянальнай процант рабочых у складзе пленуму ЦСПСВ — 79,7, пленуму ЦП саюзаў — 71,7 проц. рабочых.

Па лініі савецкіх органаў у складзе пленуму ЦВК процант рабочых — 48, у складзе прэзыдыуму акрвыканкомаў—34,8, пленуму акрвыканкомаў — 34,9.

Некалькі горшае становішча мы маем у складзе раду нашых савецкіх органаў. Асабліва кепскае становішча мы маем па лініі земельных органаў, у іх процант рабочых нязначны — прыкладам 8-9 проц. У аддзелах аховы здароўя процант рабочых — 7, у Наркамасьвеце — 9,8, у цэнтральным савецкім апараце—17,5. Па лініі фінансавых органаў 18,3 пры налічаньні ў той-жа час у цэнтральным савецкім апараце і органах Наркамфіну 77 і 74 проц. служачых. У банках склад рабочых у кіраўнічых органах — 13 проц. Асабліва вызначаюцца органы ЦСУ, дзе процант рабочай праслойкі складае усяго 2,1 пры наяўнасьці 97,9 служачых. Тое-ж самае і па лініі акруговых апаратаў статыстычнага кіраўніцтва.

У цэлым радзе нашых важнейшых партыйных, прафэсыянальных, гаспадарчых і некаторых савецкіх арганізацый мы маем з году ў год рост пралетарскай праслойкі ў складзе кіраўнічых кадраў. Аднак, у радзе нашых савецкіх органаў мы ня можам прызнаць становішча з кіраўнічымі кадрамі здавальняючым.

Тэмп вылучэньня і выхаваньня новых кіраўнічых пралетарскіх кадраў, тэмп арабочваньня нашага савецкага апарату, цэлага раду важнейшых савецкіх органаў — адстае. Пры наяўнасьці такіх вялікіх патрабаваньняў, якія прад'яўляюцца да нас з боку нашай сацыялістычнай прамысловасьці, з боку калектывізацыі і г. д. — тэмп нашай работы на сёнешні дзень па падрыхтоўцы новых кіраўнічых пралетарскіх кадраў адстае ад тэмпу разгортваньня нашае сацыялістычнае гаспадаркі. Ужо на сёнешні дзень мы маем некаторы разрыў паміж тым, што нам трэба даць нашай сацыялістычнай гаспадарцы і тым, што мы робім і даем.

Калі партыя не мабілізуе ўсіх сіл, усёй сваёй увагі і энэргіі для ўзмацненьня тэмпу падрыхтоўкі кіраўнічых пралетарскіх кадраў, то стварэецца небясьпека, што мы ня здолеем у належнай меры правільна забясьпечыць кіраўніцтва ўсім нашым сацыялістычным будаўніцтвам.

Мы крыху больш за апошні пэрыяд пачалі гаварыць аб падрыхтоўцы кіраўнічых кадраў, але практычная работа па лініі падрыхтоўкі кадраў ящчэ не разгорнута. Мы маем часамі нават некаторую недаацэнку вялікага палітычнага значэньня пытаньня адносна кадраў з боку цэлага раду таварышоў і кіраўнічых работнікаў.

Асноўная прычына, чаму пытаньне падрыхтоўкі кіраўнічых кадраў не атрымала ящчэ належнага размаху да гэтага часу зводзіцца, папершае, да таго, што цяжар работы падрыхтоўкі кіраўнічых кадраў да гэтага часу ящчэ, галоўным чынам, кладзецца толькі на партыйныя камітэты.

Важнейшая работа па вылучэньні рабочых ад варштату на кіраўнічую работу да самага апошняга часу ў рабоце прафэсыянальных арганізацый займала вельмі невялікае месца. Калі мы па гэтай лініі маем дасягненьні, то яны цалкам і поўнасьцю адносяцца за кошт партыйных ячэек і партыйных арганізацый. Партыйныя ячэйкі на вытворчасьці сёе-тое рабілі ў гэтым напрамку, а заўкомы і ўсе іншыя зьвяньні прафэсыянальных арганізацый гэтай справай не займаліся. Гэта-ж цалкам і поўнасьцю адносіцца да каапэрацыі, якая, маючы шырокі каапэрацыйны актыў, апрача арганізацый некаторых курсаў, да таго-ж ящчэ дрэнна паставленых, зрабіла надзвычайна мала. Тое-ж самае цалкам і поўнасьцю адносіцца і да савецкага апарату, які таксама ў гэтых адносінах зрабіў надзвычайна мала.

Тое-ж цалкам і поўнасьцю датычыць і прафсаюзаў. Прафсаюзы над гэтай справай ня думаюць, гэтае пытаньне ва ўсёй сваёй сур'ёзнасьці яны перад сабою ня ставілі.

Прыкладна такое-ж становішча мы маем і ва ўсіх іншых нашых арганізацыях—савецкіх, гандлёвых, каапэрацыйных і г. д. Такога становішча зусім нельга цярпець ва ўсёй нашай далейшай рабоце. Трэба ўзьняць адказнасьць усіх арганізацый, у першую чаргу нашых масавых арганізацый рабочае клясы — прафсаюзаў — за справу падрыхтоўкі кіраўнічых пралетарскіх кадраў. Партыйны камітэт павінен забясьпечыць пастаяннае кіраўніцтва гэтай справай, правяраць стан кіраўнічых кадраў на розных галінах нашага сацыялістычнага будаўніцтва, але асноўная адказнасьць павінна быць ускладзена на адпаведныя арганізацыі. Яны павінны практычна над гэтай справай працаваць.

Рашуча, сьмела і сыстэматычна вылучаць рабочых ад варштату

Наступны буйнейшы недахват—у тым, што няма ящчэ належнай энэргічнай работы, належнай рашучасьці па лініі вылучэньня рабочых з вытворчасьці, ня гледзячы на цэлы рад выразных дырэктыў адносна самага рашучага вылучэньня рабочых з вытворчасьці на кіруючую работу. Мы на практыцы наглядаем вялясьць, а ў некаторых выпадках таксама і простае тармажэньне ў гэтай рабоце.

Я-б вам падаў шмат фактаў. Адзін вылучэнец галоўных чыгуначных майстэрань быў пасланы ў Наркамзем і праз некалькі дзён атрымаў цэлы рад нагрузак. Яго нават вылучылі сакратаром ячэйкі. Такія адносіны мы маем і па іншых ведамствах. Нельга меркаваць, што ўсё гэта робіцца заўсёды выпадкова, што тут няма нейкай злой волі. Трэба сказаць, што ў некаторых выпадках тут ёсьць сьвядомы намер так загрузіць вылучэнца, каб ён сваю асноўную работу праваліў. Нельга ставіць пытаньня і так, каб рабочы быў адарваны ад грамадзкага жыцьця, ня меў нагрузак. Але трэба яго нагрузіць у меру, так, каб ён мог працаваць над вывучэньнем свайго апарату, мог павышаць сваю кваліфікацыю. Бо рабочы, які толькі што прышоў у савецкі апарат, павінен мець магчымасьць яго вывучыць, зразумець усю яго работу, а ў нас на вылучэнца ўзвальваюць па 5-6 розных нагрузак і ён ня мае магчымасьці ні толькі працаваць, але і паднімаць свой палітычны ўзровень, ён ня мае магчымасьці нават азнаёміцца з апаратам, у які ён пасаджаны. Гэта становішча зусім ненармальнае, з якім трэба павесьці самую рашучую барацьбу.

Я гэта ацэньваю так, што ў радзе выпадкаў сьвядома праводзіцца лінія на тое, каб дыскрэдытаваць вылучэнцаў.

Паогул работа сярод вылучэнцаў ящчэ па сёнешні дзень стаіць кепска. Праўда, мы маем некаторае колькаснае дасягненьне, але сама па сабе работа па вылучэньні, сыстэма вылучэньня, падыход да вылучэнцаў надзвычайна кепскія.

Можна было-б падаць дзесяткі розных прыкладаў, калі вылучэнцы заяўлялі аб тым, што яны да апошняга дня ня ведалі, што іх вылучаюць. У радзе выпадкаў вылучаюць па тэлефоннаму званку, пасьля гутаркі па тэлефону сакратар падбягае да варштату і кажа: ты ідзеш на вылучэньне, кідай варштат і ідзі ў такі і такі апарат. І такое вылучэньне мела месца. Такое вылучэньне нікуды ня вартае. Мы павінны адабраць усё лепшае, што мы маем, перадавое ў рабочай клясе, рабочы актыў, падабраць найбольш старых рабочых, не выпіраць маладняка ў першую чаргу, а гэтага можна дабіцца тады, калі вакол вылучэньня будуць арганізаваны масы, калі ня будзем вылучаць па «тэлефоннаму званку», а калі кожнае вылучэньне будзе абмяркоўвацца рабочай масай. Пытаньне сёньня стаіць так — ня толькі даваць рабочых-вылучэнцаў, а даць усё перадавое, усё лепшае, што мы маем у рабочай клясе.

Якія-ж задачы стаяць перад намі ў далейшым? Мы лічым, што ў цяперашні час мы ня можам уніканць устанаўленьня некаторых лімітаў, якія павінны быць выкананы на працягу гэтага году. Па лініі савецкага апарату партыйныя арганізацыі павінны вылучыць ня менш 750 чал. рабочых у цэнтральныя, акруговыя і раённыя савецкія апараты. Гэта колькасьць невялікая. Патрэба наша значна большая, але мы будзем разглядаць гэтае заданьне, як мінімальнае, якое павінна быць выканана.

Падрыхтуем камандзіраў сацыялістычнай прамысловасьці

Па лініі прамысловасьці мы ставім перад сабой задачу выкаваць 150 рабочых і работніц на кіраўнічую гаспадарчую работу — у трэсты і прадпрыемствы ВСНГ. Ставім сваёй задачай, у адпаведнасьці з пастановамі лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б), арганізацыю падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў, а таксама ставім сабе задачу—арганізацыю цэнтральных гадавых курсаў на 100 чал. для падрыхтоўкі дырэктароў для нашых прадпрыемстваў, прычым гэтыя курсы павінны складацца з перадавых рабочых, ударнікаў і ўсіх тых, якія прымаюць актыўны ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве. Вось з гэтых груп рабочых павінны камплектавацца курсы, дзе яны павінны атрымаць некаторую элемэнтарную тэхнічную падрыхтоўку, павысіць некалькі свой агульны і палітычны ўзровень, якія пасьля пойдуць на кіраўнічыя пасты ў нашай сацыялістычнай прамысловасьці. Паміма таго, нам трэба сур'ёзна паставіць перад сабою задачу — падняць тэхнічны ўзровень гаспадарнікаў.

Задача па тэхнічнай падрыхтоўцы павінна быць ускладзена на ВСНГ, які павінен быць у першую чаргу зацікаўлены справай узмацненьня сваіх кіраўнічых кадраў. ВСНГ трэба на гэту справу даць сродкі. Пікадаваць сродкаў на гэту справу ніяк нельга, трэба адпусьціць сродкі на бібліятэчкі і на курсы, трэба абавязкова забясьпечыць магчымасьць для нашых гаспадарнікаў, каб яны хоць раз у год атрымлівалі месяц — паўтара часу для падняцьця свайго палітычнага ўзроўню і сваіх тэхнічных ведаў. Нам трэба ў далёка большай меры, чым да гэтага часу, цэлы рад нашых рабочых гаспадарнікаў пасылаць для падняцьця кваліфікацыі заграніцу, на лепшыя заводы нашага Саюзу.

Аб кадрах кіраўнікоў і арганізатараў калгаснага будаўніцтва

Наступны важны абсяг — гэта падрыхтоўка кадраў для калектывізацыі.

У нас ёсьць пастанова наконт мабілізацыі 500 рабочых Добрая справа, калі гэта мабілізацыя будзе праведзена, як належыць. Мне расказвалі таварышы-сормаўцы, што нас тут на пленуме віталі, як яны там падыйшлі да гэтай справы. Мне адаецца, што гэта вартае прыкладу. Сормаўцы гаварылі, што яны вылучылі на гэту справу цэлы рад сакратароў цэхавых ячэек, кіраўнікоў цэхпрафбюро і г. д. Сормаўцы падыйшлі да гэтай справы сур'ёзна.

Я лічу, у мяне такое ўражаньне, што ў нас належнага сур'ёзнага падыходу да гэтай справы няма. Характэрнай зьяўляецца гутарка аднаго таварыша, які прыкладна разважае так: «што-ж мы 500 чалавек пашлем у калектывы, 750 чалавек — у савецкі апарат, што-ж у нас застанецца на прадпрыемствах? Мы скора дойдзем да такога стану, што аголім прадпрыемствы, вычарпаем увесь рабочы актыў і наш палітычны ўплыў на вытворчасьць аслабне».

Такія разважаньні зусім няправільныя, яны проста вынікаюць з недаацэнкі значэньня задачы ўзмацненьня нашых кіраўнічых кадраў, вылучэньня лепшых нашых перадавых рабочых на справу сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Тут пытаньне ня ідзе наконтахвяр, тут неахвяры патрабуюцца ад рабочае клясы, а гутарка ідзе наконт простага абавязку рабочае клясы: паслаць лепшых сваіх людзей у калектывы для кіраўніцтва, для ўзмацненьня пралетарскага ўплыву, для забесьпячэньня цьвёрдай клясавай лініі ў рабоце дзяржапарату і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Мы намячаем мабілізаваць ящчэ 500 чал. на працягу году для калектывізацыі, усяго — 1.000 чал. Гэта мізэрная ліча. У сучасны момант мы маем больш за 2.000 калектываў, а што будзе вясной, якія вялізарнейшыя патрабаваньні будуць прад'яўлены да нас вясною, калі ўся работа па калектывізацыі разгорнецца з новай сілай?

Мы лічым патрабным акрамя гэтага мабілізаваць таксама 100 чал. адказных цэнтральных і акруговых работнікаў для ўзмацненьня кіраўнічых кадраў па калектывізацыі.

Партыйныя арганізацыі павінны накіраваць у калгасы кадры выпрабаваных, вытрыманых, надзейных работнікаў, здольных стаць на чале калгаснага будаўніцтва і мабілізаваць батрацтва і беднату на ящчэ больш бязьлітасную барацьбу з кулаком, на ліквідацыю кулацтва, як клясы.

Рабочы актыў—на кіраўнічую работу ў прафсаюзах і каапэрацыі

Па лініі прафсаюзных кадраў мы таксама ставім перад сабою задачу перасоўкі цэлага раду прафсаюзных работнікаў на гаспадарчую работу і наадварот — трэба найсьці па лініі вылучэньня новых кіраўнічых кадраў прафсаюзнага апарату.

Мы надаўна слухалі паведамленьне ЦСПСБ наконт кіраўнічых кадраў прафсаюзаў. Аказваецца, што там ёсьць значны процант таварышоў, якія надзвычайна доўга сядзяць на прафсаюзнай рабоце і якіх трымаць ящчэ на прафсаюзнай рабоце няма ніякай патрэбы, якіх можна перасунуць, асьвяжыць, вылучыць на тыя або іншыя вучасткі гаспадарчай работы, з якіх, можа быць, частку трэба паслаць на вучобу таму, што сядзяць ужо па 5-6 год добрыя таварышы, надзенныя партыйцы, але якія ўжо адсталі крыху, тэарытычны ўзровень якіх трэба падняць.

Трэба гэту справу праводзіць больш рашуча, больш сьмела. Таксама па лініі каапэрацыі. У асаблівасьці я падкрэсьліваю задачу, якая стаіць перад намі па лініі рабочай каапэрацыі, дзе мы маем агіднейшае становішча, дзе толькі 28 проц. рабочых у складзе кіраўнічых кадраў рабочай каапэрацыі, Найшырэйшы актыў рабочых і работніц ёсьць, які прымае самы актыўны, жывы ўдзел у будаўніцтве каапэрацыі, ёсьць каго высоўваць, а ўсяго рабочых — 28 проц., 65-70-жа проц. — служачыя ў кіраўнічым складзе рабочай каапэрацыі. Гэтае недапушчальнае становішча.

Мы таму ставім перад сабою задачу, каб на працягу гэтага году давесьці процант рабочых у складзе кіраўнічых кадраў рабочай каапэрацыі хоць-бы да 60 проц. Гэта мінімум, а таксама трэба ўзьняць процант работніц у кіраўнічым складзе рабочай каапэрацыі таксама нізкі — усяго 15 проц.) да 25-30 проц.

Задачы падрыхтоўкі пралетарскіх навуковых і культурных кадраў

Я пераходжу цяпер да пытаньня падрыхтоўкі і стану нашых культурных кадраў. Тут мы маем становішча непараўнальна горшае, чым у радзе іншых галін. Я падаваў процант рабочай праслойкі ў складзе нашых кіраўнічых органаў Наркамасьветы. Ён надзвычайна невялікі — 9,8 проц. Але калі мы возьмем склад нашых навуковых работнікаў, то тут становішча ящчэ горшае.

Рабочая праслойка ў кіраўнічым складзе навуковых працаўнікоў складае ўсяго 6 проц., пры 84 проц. служачых. Навукова-дасьледчы інстытут імя Леніна — 12,5 проц. пры наяўнасьці 50 проц. служачых і 35,5 проц. сялян. Акадэмія Навук — 3,4 проц. рабочых і 45,7 проц. сялян і нават у складзе Камвузу становішча ня вельмі спрыяючае — 25 проц. рабочых.

Сярод выкладчыкаў тэхнікаў 6,9 проц. рабочых, 45 амаль 46 проц. служачых, 38 проц. сялян. Я ня буду падаваць другіх даных, якія характарызуюць сацыяльны твар нашых навуковых працаўнікоў сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў.

У вогуле трэба сказаць, што сацыяльны склад навуковых працаўнікоў зьяўляецца нездавальняючым.

Таму перад намі павінна з усёй вострасьцю стаць пытаньне наконт падрыхтоўкі навуковых кадраў. Падыход да гэтага пытаньня з боку цэнтральных арганізацый не заўсёды правільны. У адносінах да падрыхтоўкі навуковых кадраў, у адносінах да таго, каб з нашых выпускаў адабраць лепшых партыйцаў, лепшых беспартыйных выхадцаў з рабочых, людзей блізкіх нам, і забясьпечыць ім магчымасьць прайсьці патрэбны стаж навуковай работы, — тут падыход у нас часта зусім няправільны.

Я мог-бы падаць цэлы рад прыкладаў і з боку мясцовых парткомаў і з боку ЦК партыі, калі часта мы бярэм таварыша, зьнімаем яго з навуковай работы. Мы гэта робім у сілу крайняй патрэбы — усё гэта правільна. Аднак, мне думаецца, што трэба ў далейшым рашучэй унікаць гэтага.

Тое-ж самае і ў адносінах пасылкі таварышоў на вучобу. У нас вельмі часта месьніцкі падыход перамагае, калі ставіцца пытаньне аб пасылцы людзей на вучобу. І да самага апошняга часу лепшых таварышоў не пасылалі, а пасылалі людзей, якіх лягчэй за ўсё аддаць, а гэта часта аказваюцца людзі ня зусім падыходзячыя.

Такі падыход быў з боку амаль усіх нашых партыйных арганізацый, у тым ліку і з боку ЦК партыі. Нам трэба больш дасканала падыходзіць да гэтай справы, не пасылаць у Інстытут Чырвонай Прафэсуры і цэлы рад іншых навучальных устаноў людзей, якія не выключаюць асаблівага давер'я з пункту погляду ідэалёгічнай устойлівасьці, з боку партыйнай вытрыманасьці і г. д. А такія памылкі ў нашай мінулай практыцы мелі месца.

У далейшым накіраваньне на вучобу трэба рабіць больш рашуча, зусім трэба вытравіць усякія рэшткі месьніцкага падыходу, і я-б сказаў, падыходу вузкапрактычнага да гэтага найважнейшага пытаньня.

За пралетарызацыю і узмацненьне ВНУ

Пытаньне аб нашых навучальных установах. Праўда, мы за апошні год маем лепшае становішча ў адносінах камплектаваньня ВНУ.

Па мэдфаку ў наборы гэтага году мы маем 54 проц. рабочых, на праўгасе — 68 проц., на хэмфаку — 72 проц., на пэдфаку — 22 проц. і сялян — 55 проц. У с.-г. акадэміі рабочых — 42 проц., сялян — 38 проц. На рабфаку рабочых — 49 проц., батракоў — 25 проц., у палітэхнікуме рабочых — 64 проц., сялян—22 проц. У пэдтэхнікуме рабочых — 28 проц., сялян — 50 проц., у сельска-гаспадарчых тэхнікумах рабочых—35 проц., сялян — 54 проц.

У адносінах партыйнага і камсамольскага складу становішча горшае, асабліва па лініі пэдфаку. Я-б сказаў, што здавальняючае становішча ў хэмфаку, дзе прынята 56 проц. партыйцаў і 17 проц. камсамольцаў. На пэдфаку становішча значна горшае, процант партыйцаў невыстарчальны. У с.-г. акадэміі процант партыйцаў складае 13, у палітэхнікуме тое-ж самае, затое камсамольцаў — 47 проц. У палітэхнікуме партыйцаў — 0,4 проц., камсамольцаў — 37 проц.

Пытаньне аб разгортваньні па лініі Наркамасьветы, па лініі прафарганізацыі работы па падрыхтоўцы ў ВНУ, тэхнікумы, зьяўляецца пытаньнем надзвычайна важным. Мы ня здолеем сур'ёзна палепшыць сацыяльнага складу нашых навучальных устаноў, ня здолеем забясьпечыць у далейшым належнай рабочай праслойкі ў складзе нашых навучальных устаноў, калі справа па падрыхтоўцы ня будзе пастаўлена на належную вышыню. У Горацкай с.-г. акадэміі партыйцаў — усяго 13 проц., рабочых — 23 проц., сялян — 51 проц., прычым, якіх сялян — невядома. Ніякай статыстыкі няма — кулакі гэта, сераднякі, ці беднякі. Зразумела, можна меркаваць, што процант беднякоў сярод іх повялікі, што пераважная частка — серадняцкая, але бясспрэчна, сярод іх таксама значная праслойка кулакоў. Служачых — 22 проц.

Але самае характэрнае — вялізарнейшы адсеў. Я вам падам табліцу колькі за 4 гады скончыла акадэмію: у 1925-26 г. — 80 проц., у 1926-27 г. — 60 проц., у 1927-28 г. — 43 проц. З кожным годам — усё менш і менш. Таксама зусім недапушчальным зьяўляецца вялікі адсеў: за 3 гады скончыла акадэмію 545 чал., а адсеў за тры гады складае 425 чал. Гэта агіднейшае становішча. Кіраўніцтва акадэміі павінна ўзяць самы рашучы курс у адносінах ліквідацыі другагодніцтва, такога ганебнейшага зьявішча, якое ёсьць сёньня.

Я ня буду падрабязна гаварыць наконт асьпірантуры, але і тут становішча таксама няспрыяючае. Мы ставім перад сабой задачу — адабраць ня менш 200 чал. з ліку скончыўшых ВНУ і ВНТУ, у тым ліку ня менш 75 проц. камуністых і камсамольцаў, і паслаць іх ва што-б там ні стала на навуковую работу.

Што-ж датычыць пытаньня наконт нашых навукова-дасьледчых устаноў—гэта справа пастаўлена вельмі дрэнна. Кіраўнічы склад у цэлым радзе нашых навукова-дасьледчых устаноў зусім не забясьпечвае там выкананьне тых задач, якія ўскладзены на гэтыя навукова-дасьледчыя ўстановы. Трэба, перш-ня-це, рашуча паставіць пытаньне, каб стварыць якое-небудзь кіраўніцтва гэтымі ўстановамі, знайсьці для іх які-небудзь кіраўнічы орган, забясьпечыць належнае кіраўніцтва.

Наркамзем і НКА ящчэ ня маюць дакладнай пяцігодкі па падрыхтоўцы кадраў

Я ня буду пералічваць усіх тых задач, якія стаяць перад намі ў абсягу падрыхтоўкі тэхнічных кадраў. Патрэбнасьці тут, зразумела, вялізарныя. Тут мы маем некаторыя разыходзіны паміж патрэбнасьцю, якую вылічвае НКА, і патрэбнасьцю, якую вылічвае Наркамзем. У вогуле, у нас няма дакладных разьлікаў — колькі трэба будзе тэхнічных кіраўнікоў—інжынэраў, каморнікаў, агрономаў і г. д. Няма ящчэ яснага пляну па пытаньні адносна пяцігодкі, падрыхтоўкі кіраўнічых тэхнічных кадраў і спэцыялістых і г. д. Гэта трэба зрабіць.

Мы адстаем значна ад іншых раёнаў нашага Саюзу. Наркамзему, паводле яго заявы, патрэбна будзе спэцыялістых з вышэйшай падрыхтоўкай 8 тысяч чалавек. Я лічу, што гэтыя лічбы некалькі перапавялічаны Наркамземам. Іх можна значна скараціць, але калі мы нават іх напалову скароцім— замест 8 тысяч спэцыялістых з вышэйшай падрыхтоўкай пакінем 4½ тысячы, то мы і такое колькасьці ня маем. С.-г. акадэмія нам за гэты пэрыяд зможа даць толькі паўтары тысячы чалавек і таму трэба сур'ёзна задумацца над гэтай справай. Трэба сур'ёзна падумаць адносна прапускное здольнасьці нашай с.-г. акадэміі і іншых ВНУ і спэцыяльных навучальных устаноў аб пашырэньні сеткі с.-г. тэхнікумаў, аб павялічэньні іх з будучага году на 50-60 проц., а можа нават і больш. Трэба пашырыць сетку сярэдніх навучальных устаноў, інакш мы не вырашым задач, што стаяць перад намі.

Выраўняць фронт

Камсамол, які, як вядома, павінен і можа адыгрываць вялізарную ролю ў справе падрыхтоўкі кадраў, да апошняга часу ў гэтых адносінах нічога не зрабіў. Я-б сказаў, што камсамол ганебна мала зрабіў у сэнсе падрыхтоўкі кадраў, а камсамол мог-бы праводзіць вялізарную работу па гэтай лініі, таксама як і па лініі камплектаваньня навучальных устаноў, падрыхтоўкі моладзі і г. д.

Камсамол павінен гэтае пытаньне паставіць з усёй сур'ёзнасьцю, дабіцца карэннага пералому з боку ўсіх камсамольскіх арганізацый. Я-б сказаў, што мы павінны проста паставіць паўны ліміт перад камсамолам, каб ён падрыхтаваў поўную колькасьць чалавек—250-300 — на розныя вучасткі нашай кіраўнічай работы на працягу гэтага году. Трэба значна ўзмацніць уплыў камсамолу ў нашых навучальных установах, дзе гэты ўплыў часамі надзвычайна слабы, дзе вельмі часта робіць уплыў беспартыйная моладзь, дробна-буржуазна настроеная, шавіністычная моладзь і г. д. Становішча зусім недапушчальнае.

(Працяг дакладу на 3-й старонцы).

Да зьезду навукова-дасьледчых працаўнікоў с.-г. БССР

Абвостраная клясавая барацьба ў краіне выклікае працэс рэзкай дыфэрэнцыяцыі і сярод спэцыялістых, якія абслугоўваюць усе галіны народнае гаспадаркі. Пераважная большасьць спэцыялістых ідзе ў нагу з сацыялістычным будаўніцтвам, дапамагае партыі і пралетарыяту ў вялікай справе перабудовы гаспадаркі на новых сацыялістычных падставах. Самая нязначная частка спэцыялістых, зьяўляючыся ідэолёгам капіталістычных элемэнтаў краіны, вядзе разам з нэпманам і кулаком падрыўную работу, ясна выступаючы супроць дыктатуры пралетарыяту. Але ёсьць і сярэдзіна, так званае «балота» лёяльна настроеных спэцыялістых у адносінах да сучаснага будаўніцтва, якія працуюць пастолькі, паколькі патрэбны сродкі для пражыцьця. Вось перад гэтай групай старых спэцыялістых, сучасны пэрыяд ставіць пановаму пытаньне. Быць толькі «лёяльным» ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы ня можна. Сядзець і назіраць з боку ўсё тое, што зараз адбываецца ў краіне, — ганебна. Калі рабочая кляса вядзе пераможнае наступленьне на капіталістычныя элемэнты ў горадзе і вёсцы, калі ва ўсю шырыню пастаўлена пытаньне аб зьнішчэньні кулацтва, як клясы, у гэты момант можна ісьці або разам з пралетарыятам, або супроць яго. Трэцяга шляху няма.

Партыя рашуча паставіла пытаньне аб падрыхтоўцы новых пралетарскіх кадраў для абслугоўваньня ўсёй сацыялістычнай гаспадаркі і ў прыватнасьці сельскае гаспадаркі. Але разам з пашыраным тэмпам падрыхтоўкі новых кадраў паўстае патрэбнасьць перападрыхтоўкі старых кадраў. Калгаснае будаўніцтва ёсьць зьява зусім выключнага і ў літаральным сэнсе слова сусьветнагістарычнага значэньня. Буйныя калгасныя гаспадаркі, якія ахапляюць цэлыя раёны, будаўніцтва агра-індустрыяльных камбінатаў на тэрыторыі 100.000 і больш гэктар. — высоўваюць перад тэарытычнай думкай зусім новыя праблемы.

Паўстаюць задачы плянавай арганізацыі сацыялістычнай гаспадаркі на вялікіх па разьмерах тэрыторыях. Утвараюцца новыя формы арганізацыі работы, новыя мэтады вырабу і разьмеркаваньня. Гэта выклікае абсалютную патрэбнасьць перабудаваць сыстэму і мэтады навуковай і навукова-дасьледчай работы.

Для таго, каб навука не адставала ад вытворчай практыкі, якая шпаркімі тэмпамі рухаецца ўперад, для таго, каб ёю маглі кіравацца мільёны будаўнікоў — для ўсяго гэтага разьвіцьцё самое навуковае думкі павінна ісьці значна больш шпаркім тэмпам, чым гэта мы маем зараз.

Акрамя гэтага ў работу па зьбіраньні практыкі масавае творчасьці трэба ўцягнуць шырокія масы калгасьнікаў. Ящчэ Ленін у сваім артыкуле «Як арганізаваць спаборніцтва» пісаў, што навуковым працаўніком «без дапамогі і кіраўнічай ролі практыкаў-арганізатараў «з народу», з рабочых і працоўных сялян ні ў якім вы

ПАДРЫХТОЎКА ДА СЯЎБЫ

4-хмесячная валакіта з рамонтам с.-г. машын

Да гэтага часу яшчэ ня прыступлена да арганізацыі рамонтных майстэрань

Вузка-ведамственыя інтарэсы ставяцца вышэй агульна-дзяржаўных

Пленум ВСНГ

Тэмпы не забясьпечваюць выкананьня прамфінплянаў

Беларуская прамысловасьць у першым квартале мела рад прарываў—аб гэтым дакладвае пленуму т. Шульман.

Выкананьне вытворчага пляну ў першым квартале складае 93,6 проц. Праўда, гэты разьмер выкананьня значна лепшы, чым у першым квартале мінулага году, калі плян быў выкананы ўсяго на 88,6 проц., але гэтага мала, у гэтым годзе пры задачах, якія значна ўскладніліся, мы ня можам дапусьціць нават самага нязначнага адставаньня ад праграмы.

Якія-ж трэсты і прадпрыемствы больш за ўсё адсталі ад выкананьня пляну? Вось яны—**Белмэталятрэст** (86,5 проц.), **фабрыка акуляраў** (81 проц.), **«Дняпроўская Мануфактура»** (86,3 проц.), **Белскуртрэст** (84 проц.), А на самым апошнім, самым ганебным месцы ідзе **галянтарэйная фабрыка**, якая выканала плян толькі на 50 проц.

Бязумоўна, мы павінны адкінуць усе спасыланьні на новыстарчальнае забясьпячэньне сырцом—за гэтымі пастаянными спасыланьнямі часта хаваюцца няўнасьць тэхнічных непаладак, няздольнасьць выразна, напружана працаваць, як гэтага вымагаюць сучасныя тэмпы. Мы-ж бачым, што недахват сырцу зусім не закрануў галянтарэйнай фабрыкі, якая так сумна выдзелілася ў адставаньні ад пляну. таксама, як не закрануў і папяровай і абутковай прамысловасьці, якія таксама адсталі ад выкананьня праграмы.

Але гэта яшчэ ня ўсё. Зараз, калі мы робім стаўку на максымальнае павялічэньне прадукцыйнасьці працы, мы бачым пагражаючыя сымптомы, якія выказваюцца ў падняцьці ўверх крывое прагулаў. Так, на шкляной прамысловасьці прагулы з 0,59 проц. (у лістападзе) падняліся ў сьнежні да 0,62 проц. у мэталяапрацоўчай прамысловасьці прагулы падняліся з 0,53 проц. да 0,61 проц. А вось на Гомельскім мэталяапрацоўчым заводзе «Пралетары» мы мелі ў чацьвертым квартале мінулага году 25 выпадкаў прагулаў, а ў першым квартале гэтага году гэта колькасьць узрасла да 44, колькасьць спазьненьняў на работу за гэты квартал узрасла з 36 да 47.

Таксама са зьніжэньнем сабекошту, якое ў першым квартале дало ўсяго 4—4,5 проц. Мы ўжо не гаворым аб нязначным разьмеры гэтага зьніжэньня ў параўнаньні з вызначанай прамфінплянам лічбай у 11,7 проц. Але, калі прааналізаваць гэту лічбу, то мы ўбачым, што той процант зьніжэньня, які нам зараз паказваюць, складаецца галоўным чынам за лік вынікаў, дасягнутых у чацьвертым квартале мінулага году. Тыя слабыя тэмпы, якія нам у першым квартале паказалі і абутковая, і галянтарэйная прамысловасьці, і некаторыя іншыя, служаць перашкодай для нашага руху ўперад пагражаюць зрывам тэмпаў нашага сацыялістычнага спаборніцтва.

Наркамгандлю ігнаруе інтарэсы саўгасаў і калгасаў

Сацыялістычная перабудова нашай сельскай гаспадаркі ідзе шпарчайшым тэмпам. Гэта высоўвае перад намі важнейшую задачу па максымальным абслугоўваньні сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, максымальным забясьпячэньні калгасаў і саўгасаў усім неабходным для разьвіцьця і пашырэньня іх.

Ня можа быць 1 гутаркі аб тым, што забясьпячэньне рамонтам сельска - гаспадарчага інвэнтару павінна быць накіравана ў першую чаргу па лініі сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі—калгасаў і саўгасаў. Дзьвёх думак у гэтым пытаньні быць ня можа. Так ставіць пытаньне партыя і савецкі ўрад.

Аднак, у Наркамгандлю БССР існуе іншая думка. Наркамгандаль лічыць магчымым забясьпечваць індывідуальны сэктар сельскай гаспадаркі ня ў меншай ступені, чым сацыялістычны сэктар. Зьвернемся да фактаў. Для рамонту с.-г. інвэнтару калгасаў і саўгасаў, для арганізацыі новых майстэрань і кузьняў патрэбна каля 4.000 тон жалеза.

Пры разьмеркаваньні жалеза, Наркамгандлем БССР сацыялістычнаму сэктару сельскай гаспадаркі выдзелена 1.600 тон жалеза (40 проц. патрэбы). У той-жа час на шырокі рынак, г. зн. на забясьпячэньне патрэб індывідуальнага сэктару сельскае гаспадаркі, Наркамгандлем было вылучана 1.200 тон гатункова-га жалеза.

Як назваць такое разьмеркаваньне?

Замест таго, каб накіраваць жалезо для забясьпячэньня патрэб сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі, Наркамгандлю адрывае ад яго вялізную колькасьць і перадае шырокаму рынку!

Толькі пасьля таго, як «Белсельхозснабом» было ўзьнята пытаньне аб недапушчальнасьці такога зьявішча, Наркамгандлю намецію (толькі намецію) зьмену свайго першага разьмеркаваньня. Толькі пазаўчора Наркамгандлю па хадайніцтве «Белсельхозснаба» намецію павялічэньне забясьпячэньня калгасаў і саўгасаў гатунковым жалезам на 300 тон за лік памяншэньня колькасьці жалеза, што адпускаецца на шырокі рынак.

Выезд на вёску для работы па калектывізацыі

Члену прэзыдыуму ЦВК БССР, загадчыку прыёмнай ЦВК, т. Дубаўцову (селяніну-вылучэнцу) дазволены выезд на два тыдні ў Гомельшчыну, адкуль ён паходзіць, для правядзеньня работы па калектывізацыі. Работа па прыёмнай на гэты час ускладзена на членаў прэзыдыуму ЦВК БССР рабочых вылучэнцаў т. т. Рагачэўскага і Дубіцкую.

БЮРАКРАТЫ ЗРЫВАЮЦЬ ПАЧЫН ГОМЕЛЬСКІХ ЧЫГУНАЧНІКАЎ

Гомельскія чыгуначнікі абвясьцілі сябе ўдарнымі для рамонту с.-г. машын

Акрземаддзелы дагэтуль не далі заказаў чыгуначным майстэрням

Рабочыя паравоза-рамонтнага заводу імя Ланцуцкага і майстэрань службы шляху ў Гомелі зьвярнуліся ў Белбюро ЦК чыгуначнікаў і гаспадарчыя органы з прапановаю перавесьці прадпрыемствы на рамонт трактараў і с.-г. машын, а таксама на выраб запасных частак да с.-г. машын.

Рабочыя паказваюць, што перавод майстэрань на рамонт с.-г. інвэнтару зусім не адабрэцца на выкананьні вытворчай праграмы па транспарце. Рабочыя майстэрань шляху абвясьцілі сябе ўдарнымі па рамонце с.-г. машын. Але гэтае пачынаньне рабочых зрываецца бюракратычнай перапіскай паміж акрземаддзелам і прафсаюзнымі арганізацыямі.

Трэба адзначыць, што, ня гледзячы на рад дырэктыў аб прыстасаваньні чыгуначных майстэрань да рамонту с.-г. машын, работа гэта пакуль што ня рухаецца з месца. Гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі чыгуначнікаў у гэтай галіне амаль нічога ня робяць. Пакуль што справа абмяжоўваецца толькі перапіскай. Акрземаддзелы дагэтуль не заключылі дагавароў аб дачы заказаў чыгуначным майстэрням.

Белбюро ЦК чыгуначнікаў зьвярнулася ў Наркамзем з прапановай безадкладна даць дырэктывы акрземаддзелам аб заключэньні дагавароў і дачы заказаў чыгуначным майстэрням.

Абураючы хаос у рамонтнай справе

Посьпех правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі залежыць у значнай меры ад сваячасовай арганізацыі рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару калгасаў і саўгасаў. Для гэтага неабходна значна пашырыць сетку рамонтных с.-г. майстэрань і кузьняў і папоўніць новым інструмантам і абсталяваньнем існуючыя майстэрні і кузьні.

Паводле пляну да веснавой пасеўнай кампаніі ў калгасах і саўгасах БССР павінна быць пабудавана новых звыш 200 рамонтных майстэрань і кузьняў. Акрамя таго, павінны быць абсталяваны і папоўнены інструмантам 400 існуючых кузьняў і майстэрань. Гэта работа павінна была быць зараз у поўным разгары

Аднак, на сёнешні дзень мы маем абураючае становішча з выкананьнем пляну арганізацыі рамонту с.-г. інвэнтару. **Да гэтага часу да арганізацыі новых майстэрань і абсталяваньня і папаўненьня інструмантамі існуючых —яшчэ нават ня прыступлена.**

Адказнасьць за гэтае недапушчальнае зьявішча падае на арганізацыі, на якіх ляжыць забясьпячэньне с.-г. сэктару інструмантамі і с.-г. інвэнтаром (Наркамгандаль, мэталятэхнічны сындыкат, спажывецкая каапэрацыя, Белпайгандаль і інш. гандлёвыя арганізацыі). Справа ў тым, што гэтыя арганізацыі вось ужо на працягу чатырох месяцаў вядуць спрэчкі аб тым, хто павінен забясьпечваць с.-г. сэктар інвэнтаром і інструмантамі.

У разгар падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі, калі кожны дзень адыгрывае вялізную ролю, арганізацыі дапускаюць 4-хмесячную цяганіну і тармозяць забясьпячэньне сельскай гаспадаркі інвэнтаром і інструмантамі, інакш, як злачынныміадносінамі да падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі, гэтага назваць нельга.

Наркамгандлю не займае рашучай пазыцыі ў гэтых спрэчках і ня прымае мер для хутчэйшага ўрэгуляваньня пытаньня. Іншыя арганізацыі (Мэталясындыкат, спажывецкая каапэрацыя, Белпайгандаль) ставяць, відавочна, свае вузкаведамственыя інтарэсы вышэй агульна-дзяржаўных інтарэсаў, вышэй інтэрэсаў пасьпяховага правядзеньня пасеўнай кампаніі.

У выніку арганізацыя рамонту с.-г. інвэнтару знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

Трэба ўмяшацца ў гэту справу арганам РСІ. Трэба прыняць зараз-жа тэрміновыя меры да выпрашэньня спрэчнага пытаньня і для забясьпячэньня сельска-гаспадарчага сэктару інвэнтаром і інструмантамі. Вінаватыя-ж у недапушчальнай цяганіне павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Трэба адзначыць, што ВСНГБ і акруговыя выканаўчыя камітэты ня выканалі пляну арганізацыі буйных стацыянарных майстэрань для капітальных рамонтаў складаных с.-г. машын (трактараў і інш.). Паводле пляну, да гэтага часу павінна было быць пабудавана ў БССР 8 такіх стацыянарных майстэрань. Між тым, дагэтуль мы ня маем яшчэ ні аднэй такой майстэрні.

У сувязі з тым, што асноўная маса маўстэрань па рамонце с.-г. інвэнтару зьяўляюцца дробнымі, звычайнымі кузьнямі і не прыстасаваны да правядзеньня капітальных рамонтаў складаных машын, трэба вырашыць пытаньне аб арганізацыі рамонту складаных с.-г. машын у чыгуначных майстэрнях і на існуючых мэталяапрацоўчых заводах.

С. Г—н.

АЧЫСТКА НАСЕНЬНЯ ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ

Весткі аб тым, як ідзе ачыстка насеньня на мясцох, што ёсьць ў распараджэньні Наркамзему БССР, гавораць аб пагражаючым становішчы. Мясцовыя арганізацыі нічога ня робяць, каб прысьпяшыць ачыстку насеньня.

На 10-га студзеня гэтага году ёсьць весткі толькі з 3-х округ БССР: Бабруйскай, Гомельскай і Менскай. Па гэтых округах да гэтага часу ачышчана вельмі мала насеньня. Так, па Бабруйскай акрузе па заданьні павінна быць ачышчана 26.430 тон насеньня, ачышчана-ж да гэтага часу толькі 1.993 тоны. Па Гомельскай акрузе павінна быць ачышчана 20.110 тон, ачышчана-ж толькі 2.692 тоны. Па Менскай акрузе заданьне—38.860 тон, ачышчана-ж—2.742 тоны.

Па гэтых трох округах заданьне выканана ў сярэднім у разьмеры 8 проц. Па іншых округах вестак ніякіх няма. Аднак, можна меркаваць, што з ачысткай насеньня там ня лепш, чым у паказаных округах.

Такое становішча з ачысткай насеньня пагражае зрывам веснавой сяўбы. Акруговыя і раённыя арганізацыі павінны прыняць рашучыя меры для разгортваньня гэтай работы.

У Наркамземе няма належных вестак аб ходзе падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі па округах БССР. Чым тлумачыцца такое становішча?

Акруговыя і раённыя арганізацыі, ня гледзячы тое, што Наркамзем БССР ня раз папярэджваў іх, каб яны своячасова дасылалі весткі аб падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі, такіх вестак не прысылаюць. Тыя округі, якія і дасылаюць гэтыя весткі (Гомельская, Бабруйская, Менская), таксама вельмі марудзяць з гэтай работай.

З прычыны гэтага зрываецца нармальны ход падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі з боку вышэйшых зямельных органаў. Наркамзем БССР перадаў у пракуратуру матар'ял для прыцягненьня да адказнасьці вінаватых у зацяжцы з прысылкай вестак аб ходзе кампаніі.

РАСПАЧАУСЯ АГЛЯД РАБОЧАЙ КААПЭРАЦЫІ

Налёт рабочых брыгад на крамы МЦРК

Учора менскія рабочыя брыгады па аглядзе рабочай каапэрацыі ўжо практычна прыступілі да сваёй работы. Звыш 120 рабочых усіх менскіх прадпрыемстваў сабраліся ў залі пасяджэньняў ЦСПСВ для ўдзелу ў налёце на крамы цэрабкопу.

Члены цэнтральнай брыгады і прадстаўнікі акругандлю кораткa інфармавалі рабочых-брыгадзіраў аб рабоце, якую яны павінны прарабіць.

Брыгадзірам былі выданы каапэрацыйныя заборныя кніжкі, гропы і брыгадзіры разышліся па крамах.

Трэба адзначыць, што праверка была наладжана вельмі дрэнна. Ранейшае не падыхтаваліся, хто куды пойдзе, у якую краму і г. д. Дакумэнты і гропы выдаваліся неарганізавана, брыгадзіры, якія зьявіліся ў 10 гадз. раніцы, разышліся толькі а 12 гадзіне.

Папярэднія даныя работы брыгад ужо гавораць аб радзе ненармальнасьцяй у крамах ЦРК. Так брыгадзіры кажуць аб тым, што ў крамах «прынцыповы» не даюць рэшты паўкапейкі. Наглядаецца ў радзе крам недазважваньне тавараў, а ў некаторых крамах адваротная зьява—пераважваньне тавараў. Ёсьць рад выпадкаў перапіты за тавары. Так, у 17-й краме шкарпэткі коштам у 1 руб. 35 кап., чамусьці лічаць 1 руб. 95 кап. У 12-й крамо мыла ў 22 кап. прадаецца за 24 кап., ячныя крупы замест 26—30 кап.

Наглядаецца выпадкі продажу бракованага тавару, які ні ў якім разе ў продаж не павінен быць пушчаны (скабяны магазын).

Побач з гэтым, брыгады выявілі рад ненармальнасьцяй у абслугоўваньні спажыўцоў. Так, у некаторых крамах тавары ўпакоўваюцца ў цьвёрдую паперу, якая значна зьмяншае вагу тавараў. У іншых крамах наадварот, зусім адсутнічае пакавальная папера.

Найбольшая блытаніна наглядаецца ў мясных крамах. Мяса 3-га гатунку прадаецца, як першагатунковае. Спажыўцом даецца ня тое мяса, якое яны патрабуюць і г. д.

Брыгадамі таксама адзначаны грубыя адносіны з боку некаторых прадаўцоў да спажыўцоў, усё яшчэ наглядаецца вялікія чаргі. Адзначана таксама, што ў радзе крам штаты зусім не падрыхтаваны, што адбіваецца на хуткасьці выдачы тавараў.

Вынікі праверкі цэн, зробленыя рабочымі брыгадамі, будуць абвешчаны ў друку пасьля падсабізнага азнаямленьня з дакладамі рабочых брыгад.

Брыгады ЦСПСБ выехалі ў вёскі

Учора некалькі брыгад ЦСПСБ выехалі ў вёскі для дапамогі і праверкі падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі. Сёньня выяжджае рэшта брыгад—усяго ў акругі БССР ЦСПСБ накіроўваецца 7 брыгад прафработнікаў. Брыгады прабудуць на мясцох 30 дзён.

Рахунковыя працаўнікі--у калгасы!

Улічваючы вялікую ролю калектывізацыі сельскае гаспадаркі і неабходнасьць удзелу ў гэтай рабоце рахунковых працаўнікоў, прапану ЦП саюзу савецкіх і гандлёвых служачых мабілізаваць мяне для працы ў калгасах і выклікаю пасьледваць майму прыкладу т. т. Краснаперка, Рашала і Катлярова.

Рах. працаўнік бюро даручэньняў ПЯРЭЛЬМАН.

Каштоўныя рэчы ў фонд індустрыялізацыі

Жонкі рабочых вагонных майстэрань у першых радох

З кожным днём узмацняецца ўдзел работніц і жонак рабочых у сацыялістычным будаўніцтве.

Жонкі рабочых з чыгункі, рабочых гарбарні «Бальшавік», супрацоўнікаў НКФ працавалі ў дні каляд на карысьць індустрыялізацыі краіны.

Зараз па прыкладзе работніц і жонак рабочых мчачінкай фабрыкі, распачаўся шырокі рух за здачу каштоўнасьцяй: золата, срэбра, медзі і інш. у фонд індустрыялізацыі.

На мчачінкай фабрыцы зараз сабрана 8 залатых пярсьцёнкаў, некалькі пар завушніц; у арцэлях сампрамкаапэрацыі сабрана ўжо шмат каштоўных рэчаў, пачынаючы ад залатых пярсьцёнкаў і завушніц і канчаючы срэбнымі чаркалі, лыжкамі, меднымі рондлямі і падсьвечнікамі. У першых радох энтузіястых ідуць жонкі рабочых вагонных майстэрань.

На апошнім сходзе жонак рабочых чыгункі адна дэлегатка, аддаючы пярсьцёнак і залаты крыжык, сказала: «Хацела рабіць залатыя зубы, але нехай лепш пойдзе на карысьць індустрыялізацыі».

На чыгунцы сабраны дзесяткі залатых рэчаў.

ЛЕВІНА.

Акруговая канфэрэнцыя рабочых будаўнікоў

У Менску зараз адбываецца акруговая канфэрэнцыя рабочых-будаўнікоў. У рабоце яе прымае ўдзел 160 дэлегатаў.

Канфэрэнцыя шмат увагі аддала дакладу старшыні ЦП саюзу тав. Кавалёва аб выніках апошніх пленумаў УсеЦСПС, ЦСПСБ і ЦК саюзу будаўнікоў.

Даклад выклікаў ажыўленыя спрэчкі, у якіх паказалася на рад хібаў у рабоце саюзных арганізацый будаўнікоў.

На вячэрнім пасяджэньні 18 студзеня канфэрэнцыя заслухала даклад старшыні камітэту па будаўніцтве пры СНК БССР тав. **Гэйнэ** аб падрыхтоўцы да надыходзячага будаўнічага сэзону.

Трэба адзначыць, што, ня гледячы на рад важных пытаньняў, што стаяць на канфэрэнцыі,, і разасланыя запрашэньні, гаспадарнікі на канфэрэнцыі ня прысутнічаюць.

Аб сацыялістычнай рэканструкцыі і задачах КП(б)Б па ўзмацненьні падрыхтоўкі і вылучэньня кадраў

Даклад тав. ГАНТМАНА на студзеньскім пленуме ЦК КП(б)Б.

Аб кіраўнічых кадрах КП(б)Б

Пытаньне наконт кадраў, непасрэдна зьвязаных для кіраўнічай партыйнай работы.

Трэба рашуча дабівацца больш сьмелага, больш шырокага вылучэньня рабочых ад варштату на кіраўнічую работу. Перабудова нашай работы павінна ісьці па лініі ўзмацненьня тэарытычнай падрыхтоўкі нашых кіраўнічых кадраў. У нас ёсьць пастановы ў гэтай галіне, але ўсё-ж мы ў гэтых адносінах вельмі мала зрабілі. Ёсьць цэлы рад пастаноў, каб арганізаваць завочнае навучаньне, а ў выніку атрымалася, што завочнікі не здаюць залікаў і зусім не працуюць. У нас ёсьць цэлы рад кіраўнічых таварышоў, якія абсалютна нідзе ня вучацца. Тут пытаньне стаіць надзвычайна востра. У адносінах гэтай катэгорыі таварышоў прыдзецца ўжыць «прымусовую» сыстэму. Ёсьць рад таварышоў у складзе нашых кіраўнічых кадраў, якія не выяўляюць свайго палітычнага твару, абыходзяць моўчкі, часта ня выказваюцца па важных пытаньнях, што хаваюць усю нашу партыю. Я лічу, што трэба праводзіць рашучую барацьбу з гэтымі зьявішчамі. Кіраўнічыя кадры ня маюць права абыходзіць моўчкі тыя, ці іншыя пытаньні, якія хвалююць нашу партыю. Трэба, каб па гэтых пытаньнях яны выяўлялі свой твар, выразныя адносіны да іх. Трэба перабудаваць работу па лініі рашучай барацьбы з асобнымі момантамі сямейнасьці, якая дзе-ні-дзе яшчэ ёсьць у галіне падбору кадраў. Мы павінны весьці тут самую рашучую і бязьлітасную барацьбу. У першую чаргу павінны ўлічвацца ўстойлівасьць, партыйная вытрыманасьць і інш. якасьці таварыша. Яшчэ больш узмацніць падрыхтоўку нашых рабочых кадраў, пралетараў-беларусоў. Ні ў якім выпадку нельга адмаўзацца ад гэтага пытаньня ва ўмовах нацыянальнай рэспублікі. Гэту лінію трэба праводзіць з усёй цьвёрдасьцю. Але адначасова востра пытаньне ставіцца аб устойлівасьці, ідэалёгічнай вытрыманасьці тых ці іншых таварышоў.

Мы павінны ўлічваць сацыяльнае становішча і паходжэньне таварышоў, партыйны стаж і г. д. Зразумела, ёсьць шмат маладых партыйцаў, якія бясспрэчна ўжо выявілі свой палітычны твар, праявілі сябе ідэалёгічна ўстойлівымі камуністымі, здольнымі перамагаць розныя труднасьці. Мы іх не адкідаем у бок. Мы павінны вылучаць і маладыя кадры. Гутарка ня ідзе аб новай прынцыповай устаноўцы ў пытаньні кіраўнічых кадраў. Памойму, пытаньне ставіцца пановаму ў сэнсе сувязі з тымі вялізнымі тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва, у сувязі з вялізнымі патрабаваньнямі, якія прад'яўляюцца на кіраўнічыя кадры. Пытаньне ставіцца пановаму ў тым сэнсе, што ўсю гэту работу трэба праводзіць больш узмоцненым баявым тэмпам, надаць гэтай рабоце патрэбны рэвалюцыйны размах.

Але нельга гаварыць, што партыя зьмяняе прынцыповую ўстаноўку ў гэтым пытаньні. **Ніякіх прынцыповых змен бальшавіцкай лініі партыі ў адносінах падрыхтоўкі і вылучэньня пралетарскіх кадраў у партыі няма.**

У РАЕНАХ І СЕЛЬСАВЕТАХ НЕ СЬПЯШАЮЦЦА

(Ад нашага бабруйскага карэспандэнта)

Праведзеная нядаўна праверка падрыхтоўкі да веснавой сяўбы выявіла, што ў раёнах і сельсаветах не сьпяшаюцца, прытрымліваюцца тэй думкі, што «вясна яшчэ далёка—пасьпеем».

Абагульваньне маемасьці ў калгасах вядзецца слабым тэмпам. Таксама недапушчальна марудна праходзіць збор насеньня і ачыстка збожжа. Вось факты.

У Глускім раёне абагульваньне маемасьці **праведзена толькі ў адным калгасе, пасеўныя пляны да калгасаў не даведзены. У радзе сельсаветаў не прыступілі да ачысткі збожжа.** Насеньне Глускага крэдытнага т-ва ў большай сваёй частцы не ачышчана. Збожжа захоўваецца ў сырых памяшканьнях.

У Сьвіслацкім раёне плян пасеўнай кампаніі разгледжаны быў райвыканкомам 29 сьнежня і да месц яшчэ не даведзены. Абозы па ачыстцы збожжа мала дзе працуюць. У Старадароскім раёне пакуль што ачышчана толькі 3 проц. збожжа.

У Жлобінскім раёне плян пасеўнай кампаніі ўжо разасланы, але слаба ажыцьцяўляецца.

Горш за ўсё стаіць справа з падрыхтоўкай да сяўбы ў Клічаўскім раёне. Калектывізацыя ў раёне праводзіцца вельмі павольна, сярод насельніцтва не вядзецца ніякай растлумачальнай работы. Сельсаветы чакаюць нейкіх асобных загадаў. РВК ня ведае аб становішчы збожжаачышчальных абозаў, аб іх колькасьці. Плян збору попелу праляжаў каля 6-ці тыдняў у стале старшыні РВК.

У заключэньне некалькі слоў аб Наркамземе і Белсельтрэсьце. Яны дагэтуль яшчэ ня прыслалі саўгасу імя дзесяцігодзьдзя БССР (Мар'інскі калфонд) ні пляну вядзеньня гаспадаркі саўгасу, ні пляну пабудоў. Саўгас-жа павінен у гэтым годзе засеяць каля 2.500 гэктараў.

А. М.

ПЕРАВЫСІЎШЫ ЗАГАТОЎКІ ПА ДРУГАРАДНЫМ ЭКСПАРЦЕ--

атрымаем дадатковыя трактары

Перавядзем экспартную работу на рэйкі сацспаборніцтва

Сотні тысяч залатой валюты прападаюць кожны год

Сапраўды, ні ў аднэй краіне ня гіне столькі каштоўнага сырцу ў выглядзе адкідаў, як у СССР. На кожным прадпрыемстве можна бачыць, як затоптваюць і паляць прамасьленыя капцы, папяровую макулатуру, абрэзкі новай бляхі і нават кавалкі каляровых мэталяў. У кожнай кватэры рабочага, служачага і селяніна паляць яшчэ на сотні тысяч рублёў рызьзя і паперы. Усюды закопваецца ў зямлю і там гіне каштоўны сырэц розныя мэталёвыя часткі, скарыстаныя коркі, бляшаныя банкі, капсулькі ад вінных бутэлек, фолга, старыя цюбікі, старыя галёшы, нягодны абутак і інш.

Толькі аднаго рызьзя ў Беларусі кожны год выхозіць звыш 3-х мільёнаў рублёў, касьцей—да 400 тыс. руб., кішак—да 700 тыс. руб.

Рост загатовак зусім не адпавядае тым магчымасьцям якія мы маем. У 1928-29 годзе ўсімі загатоўшчыкамі па Беларусі загатоўлена рызьзя толькі на 1.400 тысяч рублёў, касьцей—на 106 тыс. руб., кішак—на 173 тыс. руб.

Абвешчаны конкурс на лепшыя раёны па арганізацыі збору і загатоўцы другарадных відаў сырцу з-за ядзбайнасьці загатоўшчыкаў і бязьдзейнасьці камісій, вылучаных пры акрвыканкомах і райвыканкомах, да гэтага часу патрэбных вынікаў ня даў.

Сялянства ня ведае яшчэ добра карысьці ад збору адкідаў. Не арганізаваны яшчэ абход двароў. Прыватны апарат зборшчыкаў, якім яшчэ ў большасьці карыстаюцца загатоўшчыкі (каапэрацыя, дзяржгандаль), ашукваюць сялян, часта плацячы за пуд рызьзя, які каштуе 1 руб. 36 кап., толькі аднэй хусткай коштам у 36 к. Пры такім становішчы толькі невялікая частка сялян зьбірае і здае адкіды сваёй гаспадарцы.

Райвыканкомы і райкомы партыі таксама яшчэ не зразумелі ўсяго значэньня мабілізацыі сродкаў, захаваных у другарадным сырцы. Чым інакш тлумачыць такія адказы, як «це хапае часу» (Ворша), «усяго не ахопіш» (Капыль), «мабыць, у нас у раёне няма гэтага сырцу» (Заслаўль).

Ня лепш абстаіць справа і ў гораддзе. Рабочы і служачы яшчэ ня ведае, чым канкрэтна ён можа дапамагчы нашаму экспарту. Партыйныя, камсамольскія ячэйкі і прафорганы не займаюцца такімі пытаньнямі, як арганізацыя ўтылізацыі адкідаў прадпрыемства, установы і хатняй гаспадаркі, рабочых і служачых. Зусім не адзіночныя факты перашкод з боку адміністрацыі прадпрыемстваў ва ўстаноўцы скрынак для адкідаў, аб якіх паведамляе ўнкор Л. Фрыд з лямцавай фабрыкі (гл. «Чырвоная Зьмена» ад 4/1-30 г.).

Гарадзкія саветы і рабочыя калектывы павінны зацікавіцца ў атрыманьні трактараў, якія будуць увозіцца з-за мяжы на сродкі, атрыманыя звыш пляну ад рэалізацыі другарадных відаў сырцу.

На загатоўку адкідаў трэба выкарыстаць увесь апарат камунальнага абслугоўваньня і ЖАКТ'ы.

Трэба падпягнуць і загатоўшчыкаў, якія праяўляюць яшчэ вялікую інэртнасьць і непаваротнасьць.

Перавыкананьнем экспартнага пляну павялічым імпарт трактараў для калгасаў і абсталяваньня для прамысловасьці.

К. ВЕРАМЕЙЧЫК.

Прыцягнуць грамадзкасьць да загатовак

Ход загатовак другарадных відаў сырцу за першы квартал вельмі нездавальняючы. Так, плян загатовак рызьзя выканана толькі 60,9 проц. заданьня, у Менскай—66,6 проц., Аршанскай—75,6 проц. і Гомельскай—76,7 проц.

Слаба ідзе работа па загатоўцы рызьзя па лініі Белдзяржгандлю, які выканаў толькі 69,6 проц. свайго заданьня. Спажывецкая каапэрацыя таксама не зьвярнула належнае ўвагі на загатоўкі другарадных відаў сырцу.

Загатоўка іншых відаў другараднага сырцу, да якіх адносяцца косьці, кішкі, папяровая макулатура, утыльсырэц і іншыя адкіды прамысловасьці, праходзяць яшчэ горш. Так, Віцебская, Гомельская і Бабруйская округі, ня гледзячы на наяўныя магчымасьці, **да загатоўкі касьцей амаль што не прыступілі.** Трэба наогул сказаць, што загатоўка касьцей у гарадох праходзіць вельмі слаба.

Зараз Наркамгандаль вызначыў цьвёрдыя пляны загатовак касьцей для гарадоў. Лежэзту запрапанавана адкрыць аддзяленьне для загатоўкі касьцей у Віцебску і Гомелі.

Шырокая грамадзкасьць да загатовак другарадных відаў сырцу да апошняга часу зусім ня была прыцягнута. Толькі зараз і пакуль што толькі ў адным Менску да гэтай справы прыцягнуты ЖАКТ'ы, піянэры і дворнікі. Другія округі да гэтай работы яшчэ не прыступілі. Сялянства да збору другарадных відаў сырцу зусім ня прыцягнута.

Загатоўчыя арганізацыі павінны зараз-жа шырока разгарнуць на вёсцы спэцыяльныя арцелі пры камітэтах сялянскае ўзаемадапамогі. Гэтыя арцелі павінны замяніць прыватнікаў прасолаў, якія часта ашуквалі сялян, плацячы ім не па тых цэнах, якія былі вызначаны.

На загатоўкі другарадных відаў сырцу павінна быць зьвернута ўвага партыйных, камсамольскіх і прафэсыянальных арганізацый.

Трэба памятаць, што выкананьне пляну загатоўкі другарадных відаў сырцу і экспарт за мяжу дасьць нам магчымасьць без затраты лішняй валюты атрымаць трактары для нашых калгасаў.

Суд над прасьледвальнікамі рабкора Багайскага

ШКЛОЎ. ((Наш. кар.). Трэці і чацьвёрты дзень працэсу былі прысьвечаны допыту сьведкаў. Дапытана 9 чалавек. Усе яны адзначалі, што Багайскі быў прыкладным рабочым, акуратна, сумленна адносіўся да вытворчасьці, быў адным з лепшых актывістых, карыстаўся вялікім аўтарытэтам сярод рабочых.

Сьведкі Галашоў, Цумф, Глезер, Цукуноў і інш. у сваіх паказаньнях адзначылі, што цкаваньне Багайскага групай Шкурава пераходзіла ўсякія межы. Гэтае цкаваньне цягнулася 3 гады і асабліва павялічылася, калі Шкураў быў зьняты з пасады загадчыка электрастанцыяй. Шкураў усялякім чынам імкнуўся перашкодзіць Багайскаму ў яго рабоце ў насьценгазэце, ён здолеў выжыць амаль усіх рабкораў з электрастанцыі.

Ён асабліва ўжываў мэтад правакацыйных чутак, якія кампрамэтавалі рабкораў, у прыватнасьці Багайскага, абвінавачваў рабкораў у шкодніцкіх учынках, называў іх «шахцінцамі».

Багайскі шукаў дапамогі з боку фабрычных арганізацый, але бюро парткалектыву і фабком напляваецельскі адносіліся да заяў рабкораў, лічылі ўзаемадносіны іх з групай Шкурава звычайнай склокай, драбніцай. Некаторыя з фабрычных кіраўнікоў нават дапамагалі Шкураву ў яго цкаваньні. Былы сакратар парткалектыву фабрыкі, **Раеў**, заўсёды пры выпуску насьценгазэты патрабаваў ад рэдкалегіі ўзгадніць з ім заметкі наконт адміністрацыі. Раеў нават зьнішчаў гэтыя заметкі, гаворачы, што ня трэба кампрамэтаваць адміністрацыю, падрываць яе аўтарытэт. Прыкладу Раева сьледаваў другі сакратар парткалектыву **Тарасенка**. Адночы Багайскі зайшоў у адзін з цэхаў фабрыкі, дзе быў у той час і Тарасенка, прычым апошні сказаў Багайскаму літаральна наступнае: «Чаго тут табе трэба, малачышка, прышоў шпіёніць». Член партыі Маластоўскі на раённай парткангарэнцыі заявіў, што насьценгазэта фабрыкі —у руках трацкістых.

Некаторыя са сьведак лічаць, што шрубы ў мапыны падкідваў сам Шкураў, каб кампрамэтаваць Багайскага і абвінаваціць яго ў шкодніцтве, бо Шкураў першым сам-жа знаходзіў гэтыя шрубы.

Каштоўныя паказаньні даў сьведка **Глезэр** — рабкор - электраманцёр. Ён прывёў прыклад, калі Шкураў адразу знайшоў «прычыну» дрэннай работы дынамамашыны, выцягнуў з дынама Шрубку.

А. С—ч.

***

ШКЛОЎ. (Наш спэц. кар.). Допыт сьведак усё больш выяўляе сапраўдны твар Шкурава і яго кампаніі. Шкураў—зусім чужы нам чалавек. Працуючы на фабрыцы, ён узмацняў сваю кулацкую гаспадарку. Электрастанцыю ён разглядаў, як сваю ўласную «вотчыну». Ён з нянавісьцю адносіўся да самакрытыкі і ўпарта змагаўся супроць яе посьбітаў-рабкораў.

Да 1926 году Шкураў мог працаваць спакойна. Ніхто не перашкаджаў яму. Ён больш цікавіўся выпіўкамі, чым вытворчасьцю. На электрастанцыі панавала безгаспадарчасьць.

Але вось прыехаў з рабфаку Антон **Багайскі**, прыехаў на практыку электратэхнік **Галашоў**, арганізавалася насьценгазэта, зьявіліся заметкі наконт непарадкаў на электрастанцыі. Шкураў адчуў, што за ім сочаць, што пільнае вока рабкора выкрывае непарадкі, і пачаў прасьледваць рабкораў.

— Мы,—кажа сьведка **Галышоў**,— раней былі амаль адны, але з цягам часу навакол газэты арганізавалася група актывістых з тых, хто хацеў палепшыць работу фабрыкі, хто імкнуўся змагацца з недахопамі. Першыя-ж заметкі аб непарадках на электрастанцыі выклікалі ганеньне на іх аўтараў. Шкураў ужываў асаблівыя мэтады барацьбы з самакрытыкай. Ён карыстаўся правакацыяй, шкодніцтвам. Ён даваў заданьні электраманцёрам — членам рэдкалегіі—зрабіць тую ці іншую работу і па некалькі раз зьмяняў яе плян, пасьля карыстаўся ўсякім выпадкам, каб ашаламаваць выкананьнем работы. За найменшы ўчынак падпарадкаваных яму манцёраў-рабкораў, звальнял

З ЖЫЦЬЦЯ А. Д. У. АРМІІ.

ЗА АРКАЙ МЯЖЫ

(Ад нашага спэц. карэспандэнта)

Сонца сьляпіла вочы, чыстае блакіт нае неба раскрылася прыгожай раніцай. Мы ўсе пазіралі ў вакно на дрыжачы, гатовы да адходу, аўтамабіль і нездаволена маўчалі. Некалькі журналістых знаходзіліся ў гэтым вясёлым вагоне і ўсіх нас апанавала такое моцнае гультайства, што было сорамна глядзець адзін аднаму ў вочы.

Вельмі проста. Не хацелася выяжджаць з гасьцінпай кампаніі рэдакцыі газэты «Отпор» тым больш, што энэргічны аўтар пастаянных раешнікаў сваячасова прыцягнуў некалькі вёдзер вугалю і з нязвычайнай настойлівасьцю распальваў зьверскі ўпартую буржуйку. Гэта было к месцу, бо да першых прамеиняў золаку ўсе, хто быў у вагоне, канчаткова замерзьлі, і толькі адважны рэдактар, асьцярожна высоўваючы з-пад шынэлі і кажуха пасінелы нос, а наіўнасьцю дзіяці, храбрыўся:

— Як быццам, халаднавата, га?

Але «раешник» энэргічна прывалок вугалую, печка, страціўшы супраціўленьне, прыемна распалілася; на ложках заварушыліся мумії. З-за сопак выпаўзла сонца-печка, сонца і вясёлыя прыцелі, непахісны ба зіс для пышнага росквіту гультайства. Усе пазіралі ў вакно і прыдумлялі самыя складаныя довады для таго, каб ня ехаць.

— Сёньня выключны мароз і напэўна вецер. Можа, з пяцьдзесят градусаў. Загінуць цяпер, калі кітайскае войска ў паніцы ўцякае, крыўдна і бясслаўна.

— Цёплы дзень, рэдкі дзень,—уздыхнуў рэдактар,—добры дзень для паездкі.

— А калі ў мяне няма ізы,—нясьмела заўважыў нехта ў куце, але здалёка ужо чуўён быў апошні гудок, мы хутка выйшлі з вагону і паехалі. Які раз?

Як і заўсёды, аўтамабіль адыйшоў роўна а дзесятай гадзіне. Лёгкі грузавік «АМО» вёз пошту, пачкі газэт і некалькі бліскучых круглых каробак кіноістужкі. Роўная пыльная дарога, жоўты стэп, сінія сопкі, чыстае здаровае марознае паветра. Аўтамабіль цёгка нясецца па дзівоснай прыродным шапы, побач срэбным ніткамі сьцелюцца рэйкі чыгункі і цяжка пыхкае бясконца таварны цягнік.

Адна гадзіна язды а рэдкімі прыпынкамі і паўстанкамі, дзе мы скідаем газэты, потым невялікі разьезд, чырвонаармейскія зямлянкі і рой пяплушак. Гэта славуты «86 разьезд». Тут чакаюць машыну, бяруць газэты, сьняшаючыся, пытаюцца аб навінах і шофэр зачыняе дзьверцы.

Апошні прыпынак. Аўтамабіль ляціць уперад, відна падкоўка аркі, яна сінее пад сонцам у незразумелым адзіноцтве і зьдзіўлена тырчаць па краёх пікі мініятурных вежаў. Вось ужо можна прачытаць вензалі літараў «СССР». Выццам упяршыню мы разглядаем арку. Зараз яна вытлядае дзіўна ў пустынным стэпу... Хіба што для нязьменных жартаў правадніка пошты. Ну так і ёсьць, ён адчыняе дзьверцы, з дзеславітай сур'ёзнасьцю адтатурвае губы і казённым голасам злога кандуктара цягне нарасьпеў:

— Падрыхтуйце пашпарты, ці ва ўсіх ёсьць візы? Мэрсі! Можаце ехаць!..

Далёка, направа ад дарогі чарнеюць мёртвыя акопы і сілюэты разьбітай стэпасьці. У прамёралай траве кавалкі дротавых загародак, на ходу ледзь пасьпяваем убачыць зноў ігіанцкі ход зносін, які ідзе да акопаў. Цуда ваеннай тэхнікі—гэты ход зносін. Недарма сюды сілком згналі насельніцтва і спрактыкаваныя інструктары, сыны заморскіх краін, паказвалі тут свае надзвычайныя веды. Ход зносін настолькі глыбокі і шырокі, што ня толькі войска, але і аўтамабілі маглі спакойна езьдзіць абсалютна незаўважанымі. Аб іх потым. А зараз штодзенныя экскурсіі чырвонаармейцаў ідуць да ўмацаваньняў і ўважліва вывучаюць іх. Недаступнай для артылерыі крэпасьць, бэтаніраваныя бліндажы, агароджаныя рэйкамі акопы...

— Чорт дзяры,—шчыра захапляюцца чырвонаармейцы,—тут сядзець, як у хаце, на печы. Нас-бы за чатыры гады ні адна сіла ня выбіла-б адсюль.

... Аўтамабіль ужо ляціць з усёй хуткасьцю, праворна аб'яжджаючы вазы з сенам. Раптам з-за сопак разгортваецца горад. Шаша ня прыкметна ўліваецца ў пыльныя вуліцы і вось першыя дамы, сады, крамы Манчжуры.

І адразу нас падхватвае хаатычны гураган гукаў, фарбаў і мімалётных сцэн. Скрыпяць арбы, што валочацца валасастымі муламі, жаночым толасам пяе, махаючы крыльлямі рукавоў, вугляр, рыкша-вадавоз хутка вязе ўціснутую ў калёсы бочку. З будзёнаўскай песьняй пылянць кавалерыстыя, бясшумна праяжджае зялёны ваенны аўтамабіль. У залатых рэндлях калыхаюцца ліхтары кітайскіх харчэвень, калышуцца белыя счырканыя ерогліфамі, паніваныя на кійкі, знакі шаўноў, краўцоў і цырульнікаў, а над дахамі і пад'ездамі дамоў—сьцягі чужаземцаў.

Насьпех сышытыя і рознакаляровыя сьцягі ўсеялі горад і надалі яму выгляд нейкага бурнага карнаваду. Японскія, францускія, італьянскія, амэрыканскія, ангельскія сьцягі на кожным кроку і... на капялюшох, на грудзёх, павязкай на руцэ, і бантам на манто або хустачкай на рэдыкулі. У горадзе сьвяточнае ажыўленьне, адкрыты ўсе магазыны, у японскіх цырульнях, лежачы брыюцца аброслыя грамадзяне. Нарэшце, пасьля доўгіх дзён трывогі ўстанавіўся парадак, непрызвіта хадзіць ня брытым. Шумам поўны тратуары кафэ, рэстаранаў, а ў кіно—чарга па білеты. Курачы цыгарэты, групамі гуляюць чырвонаармейцы. Ну якраз, як у сьвяточны дзень на маскоўскіх скверах.

— Дзе будзеце начаваць? (О, жах, зноў жартуе паштавік).—Тут ці ў СССР? Машына ідзя назад праз дзьве гадзіны.

Аўтамабіль ідзе далей у другі горад... На тратуары ля пакінутага рэстарану «Хижина дяди Вани» мы зноў наглядаем знаёмае юнкі вулічнага жыцьця.

Дзіўная мешаніна расійскіх, кітайскіх і японскіх шыльдаў. У кожным доме абвяшкова «Вінна-гастранамічны магазын» з гарэлкай «Фиалка», якая ня мае канкурэнтаў, і японскі лёмбард. Стварацца ўражаньне, што жыхары гораду толькі і існуюць тым, што з лёмбарду ходзяць у вінны магазын або наадварот.

Каля пад'езду гарадзкога самакіраўніцтва чарга жыхароў чакае, каб атрымаць адабраную Чырвонай арміяй ад кітайскіх салдат «доблестно» награбленную мамасьць. Там у габінэце сядзіць ранейшы гарадзкі галава з ранейшым складам. Чырвонае камандаваньне прасіла іх заняць свае месцы і клапаціцца аб горадзе. Манчжурыя жыве спакойным бястурботным жыцьцём і таму так ажыўлена і весела на вуліцах. Гуляюць адпачываючыя байцы. Яны доўга і дарэмна ўзіраюцца ў пукатыя залатыя ерогліфы, стараючыся разгадаць, што гэта: аптэка, магазын з канцылярскімі прыладамі. Надрыўна крычаць кулічныя гандляры, выклікаючы заслужанае захапленьне ў чырвонаармейцаў.

Горад жыве звычайным бытам. Толькі чырвонаармейцы на вуліцах і чырвоны сьцяг над вакзалам сьведчаць аб тым, што ня ўсё засталося бяз зьмен. Зараз пакой сонечнае раніцы ўсякага настройвае на вясёлыя і бястурботныя думкі. Але калі зараз у паветры сьвяточны гул, а кавалерыстыя, загінаючы пальцы, міміруючы гутараць з гараджанамі, калі ў «Апалё» паранейшаму ідзе «Любовь сильнее смерти», то ня так было тут яшчэ на мінулым тыдні, некалькі дзён назад. Горад перажыў жудасныя гадзіны. Толькі калі ўвайшла Чырвоная армія, калі на рагох сталі патрулі чырвоных зорак, горад ажыў і ўпяршыню за чатыры месяцы ўзварушыўся сваім бытам.

Вось што было ў Манчжурыі.

Міх. РОЗЭНФЭЛЬД.

****

Усебел руская канфэрэнцыя інжынэраў-мэталістых

18-га студзеня ў Менску адкрылася Ўсебеларуская канфэрэнцыя інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў—членаў саюзу мэталістых. У рабоце канфэрэнцыі прымае ўдзел адказны сакратар ЦБ ІТС пры ЦК саюзу мэталістых тав. Чартоў. На першым пасяджэньні былі заслуханы даклады аб рабоце Ўсесаюзнага ЦБ і Беларускага бюро ІТС.

Канфэрэнцыя абгаворыць яшчэ пытаньні аб пяцігодцы мэталапрацоўчай прамысловасьці БССР і аб падрыхтоўцы кадраў.

Всем ячейкам КП(б)Б, ЛКСМБ, фабзавместкомам и шефским товариществам!

Прибыли и поступили в продажу специальные номера:

1. „ПРОЖЕКТОР" № 3, посвященный 6-летию смерти Ленина — цена номера 25 коп.
2. „ЛИЦОМ К ДЕРЕВНЕ", посвященный сплошной коллективизации и посылке в деревни 25.000 рабочих — цена номера 15 коп.

За получением обратиться в Белорусское отделение «Правды», Советская, 61, тел. № 8-21.

ЗЬВЯЗДА.

МЕНСК

Дзе будзе будавацца новы гарадзкі тэатр

Спэцыяльная камісія зацьвердзіла новы варыянт будынку гарадзкога тэатру. Плошча тэатру вызначана ў 27.000 кв. мэтраў. Кошт будынку—3.545.000 рублёў. Камісія, пасьля абсьледваньня раду вучасткаў, прызнала найбольш мэтазгодным пабудаваць новы гарадзкі тэатр на пляцы Залатой Горкі, які займае плошчу ў 7 гэктараў і знаходзіцца на аддлегласьці 3-х трамвайных прыпынкаў ад цяперашняга будынку тэатру.

Арганізацыя беларуская геафізычная абсэрваторыя

Вясною бягучага году ў Менску пачнецца пабудова геафізычнай абсэрваторыі, праект якое распрацаваны архітэктарам тав. П. О. Валодзькa.

Абсэрваторыя будзе мець наступныя аддзелы: агульнай мэтэаралёгіі а праверкай прылад, прыкладной аграмэтэаралёгіі і мікраклімату, актынамэтрыі і атмасфэрнай электрычнасьці, аэраралёгіі і г. д.

Агульны склад спэцыялістых станцыі пры поўнай разгорнутай рабоце вызначана давесьці да 35 чалавек. Навуковае абсталяваньне для станцыі атрымана поўнасьцю.

Вярнуўся т. Хацкевіч

Сакратар ЦВК БССР тав. А. І. Хацкевіч вярнуўся з адпачынку па хваробе пасьля апэрацыі і прыступіў да працы.

Новыя члены прэзыдыуму ЦСПСБ

У сувязі з пераходам на іншую работу пленум ЦСПСБ вызваліў ад абавязкаў членаў прэзыдыуму ЦСПСБ т. т. Шаліма, Карпа, Руманава, Гальбрайха і Араноўча.

Членамі прэзыдыуму ЦСПСБ выбраны **т. т. Хлеўнікаў, Гнілякевіч** (НКП), **Рэмізэвіч** (ЦК ЛКСМБ) і **Грысэвіч** (ВСНГБ), кандыдатам—старшыня ЦП саюзу саўгандальслужачых тав. **Плетнеў.**

Страхавальнік павінен быць адказным

Дзяржстрах зьвярнуў увагу страхавальнікаў на тое, што маемасьць агрэгаманджанага сэктару павінна абавязкова страхавацца на ўсе 100 проц. Страхавая ўзнагарода зьвыш страхавой сумы выдаваецца ня будзе. Калі страхавальнік пакажа несапраўдны, а меншы кошт маемасьці, то ад гэтага будзе шкода толькі самому прадпрыемству, якому ня хопіць страхавой узнагароды на сваё поўнае адбудаваньне.

Навіны МЦРК

МЦРК пачынае адпускаць усяму насельніцтву чай у колькасьці асабістай патрэбы. Чай будзе прадавацца ў крамах МЦРК № № 39, 52, 109 і 118 а таксама ў ларку МЦРК № 4.

***

Курсы (трохмесячныя) па пераквалі фікацыі работнікаў прылаўку пачынаюць працаваць з 20-га студзеня. На курсы залічаны 70 работнікаў МЦРК.

***

У магазыне МЦРК «Маці і дзіця» арганізаваны кансультацыі доктара і пэдагога, якія будуць абслугоўваць цяжарных жанчын і дзяцей да 8-гадовага ўзросту.

***

Патакі на адным кілё на кніжку пачне адпускаць МЦРК з 20-га студзеня (па талёне жоўтага колеру, № 175).

Адказ яго прэасьвяшчэнству

Ня так даўно архіэпіскап менскі Павел (Вількоўскі) зьвярнуўся ў Менскі гарсавет са скаргаю, у якой выказаў сваё нездаволеньне з поваду... фарсаванага ўзросту ваяўнічага бязбожжа. Яго прэасьвяшчэнства, лічачы сябе асобай зусім лёяльнай да рэчаіснасьці, выказвае апаску, як-бы ваяўнічае бязбожжа не пашкодзіла інтарэсам савецкае ўлады. Шырокімі мазкамі архіэпіскап маляваў тую небясьпеку, якая тоіцца ў вучэньні ўсялякіх «невежественных братцев сектантов», да якіх могуць пайсьці веруючыя, вызваліўшыся ад праваслаўнай рэлігіі. Аргумант, так сказаць, ад ад рэлігійнай канкурэнцыі. У заключэньне яго прэасьвяшчэнства пратэставала супроць натрабаваньняў рабочых аб зачыненьні так званай чыгуначнай царквы.

Мы разумеем нездавальненьне архіэпіскапа. Гутаркі з яго прэасьвяшчэнствам на антырэлігійныя тэмы—рэч зусім некарысная. Але-ж архіэпіскап Павел падаў скаргу ў гарсавет. Ён патрабуе адказу. Гэты адказ ён атрымаў 18 студзеня. Праўда, адказ выйшаў зусім нязвычайным: не праз які-небудзь ліст па пошце, а пры ўдзеле 20.000 чал. на плошчы перад гарсаветам. Замест «крещенского водосвятия» на вуліцы вышла 20.000 ваяўнічых бязбожнікаў—гвардыя саюзу бязбожнікаў. Іх патрабаваньні былі складзены на сотнях плякатаў. Яны былі ясныя і катэгарычныя:

— Патрабуем ад гарсавету зьняць званы з усіх цэркваў і касьцёлаў і скарыстаць іх для індустрыялізацыі.

— Патрабуем ад гарсавету зачыніць чыгуначную царкву і перадаць яе пад клюб рабочых чыгуначнікаў.

Такія плякаты несьлі ня толькі чыгуначнікі, іх несьлі і мэталістыя, і гарбары, і вучні, і друкары—плякатаў быў цэлы лес.

Тысячны натоўп антырэлігійна гудзеў перад гарсаветам. У цёмнае неба ляцелі іскры ад агню, на якім дагарвалі рэлігійныя рэліквіі—абразы, крыжы, пудзілы багоў і сьвятых. І над усім гэтым—песьня:

«Далоў, далоў манахаў, рабінаў і папоў».

У гарсавеце адбывалася пасяджэньне. Яно ня было доўгім. Патрабаваньняў 20.000 нельга не задаволіць. Сапраўды, хіба яны, прыпоўпы з работы, ня маюць права на адпачынак без царкоўнага звону? Хіба яны, парваўшы з рэлігіяй, ня маюць права на тое, каб абярнуць непатрэбныя ім царквы ў клюбы? Зразумела, маюць! Таму пастанова гарсавету гаварыла—**зьняць званы з усіх менскіх цэркваў і касьцёлаў, чыгуначную царкву перадаць пад клюб рабочым чыгункі.**

Апаскі архіэпіскапа Паўла аказаліся зусім беспадстаўнымі...

Ваяўнічае бязбожжа расьце фарсаваным тэмпам. І ня толькі ў Менску, а па ўсёй рэспубліцы. Вось, напрыклад, для заспакаеньня душы архіэпіскапа, які лічыць менскіх бязбожнікаў асабліва ваяўнічымі, мы падамо некалькі лістоў з правінцыі. Аказваецца, што і там бязбожнікі ня менш ваяўнічыя. Сапраўды:

«Мы, сяляне і калгасьнікі вёскі **Гапонавічы, Лазоўкі** і калгасу **«Іскра»** адзагалосна ўхваляем: закрыць царкву і аддаць яе пад культурную ўстанову».

Сяляне вёскі **Чарно, Плешчаніцкага** раёну, **Менскае** округі, ухвалілі закрыць царкву і аддаць яе пад ссыпны пункт. Пры прыёме царквы камісія пры вобыску знайшла 43 фунты папяровых царскіх грошай купюрамі ад 3 да 100 руб., каля 20 фунт. медзі і срэбра, 10 фунт. фарбы, шоўк, фота-апарат і г. д. і г. д.

Што на гэта скажа яго прэасьвяшчэнства?

А вось яшчэ: «Агульны сход членаў **камуны імя Фрунзэ**, у ліку 320 чал., ухваліў: закрыць царкву і перадаць з усім інвентаром пад клюб. Сход ухваліў выклікаць на спаборніцтва с.-г. арцель **«Перамога»** і паслаў прывітаньне ЦК саюзу бязбожнікаў».

А вось накант абразоў. «Члены калгасу **«Чырвоны Батрак»**, Горацкага р., Арш. округі, ухвалілі зьняць у сваіх хатах абразы. Замест гэтых сродкаў папоўскага дурману, члены калгасу ўпрыгожылі свае хаты здымкамі сапраўдных барацьбітоў за справу рабочых і беднаты —Леніна і Сталіна. Яны патрабуюць ад РВК зачыненьня царквы і арганізацыі там клюбу».

«6-га студзеня г. г. у м. **Халопенічах**, Менск. округі, антырэлігійны сход у ліку 490 чал. ухваліў: зачыніць царкву, касьцёл і сынагогу, а званы перадаць на пабудову трактараў».

Спынімся на гэтым, бо такіх лістоў з вёскі—дзесяткі і сотні. І так, мы ня можам супакоіць архіэпіскапа Паўла наконт упіхаміраньня ваяўнічага бязбожжа. Больш таго, гэты працэс мы лічым зусім нармальным і заканамерным. Разам з пашырэньнем граматы, тэхнікі, разам з трактарам і калгасам прасякае ў масы і ваяўнічае бязбожжа. Царква, сынагога, касьцёл цяпер больш, чым калі-небудзь, зьяўляюцца вялікай перашкодай на шляху гіганцкай сацыялістычнай творчасьці мас. Рэлігія становіцца толькі лёсам тых, хто сапраўды «сір и убог духом». Нават цэлы рад служкаў рэлігійных культаў пачынаюць гэта разумець.

Вось нядаўна, мы пісалі пра заяву правінцыяльнага рабіна гор. Чэрыкава, Зухавіцкага, у якой ён зусім слушна пісаў: «Ввиду того, что в Чериковском районе осуществляется сплошная коллективизация и сокращается потребность в религиозных обрядностях, я отказываюсь от звания духовного раввина»...

Заява, якую непатрэбна камэнтаваць. Зараз падобныя заявы ня рэдкасьць. Мы, зразумела, далёкія ад таго, каб зрабіць такі паляпхоўны вывад, што рэлігія ўжо пераможана. **Не, саюз ваяўнічых бязбожнікаў павінен падвойваць сваю работу і энэргію.** Лік тых, каго мы павінны адваяваць ад рэлігіі, яшчэ досыць значны. І мы будзем за іх ваяваць, як-бы гэта было няпрыемна для «духоўных айцоў царквы».

Р. К.

ДА ВЕДАМА

ДЭЛЕГАТАЎ 1-ай МЕНСКАЙ АКРУГОВАЙ АГІТПРАПАГАНДЫСЦКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ МОПР'у,

якая адкрываецца 21 студзеня у ДОМЕ ПРАЦАСЬВЕТЫ

Мандаты выдаюцца з 12 студзеня штодзённа ў АК МОПР'у ад 7 да 9 гадз. увечары па паседках бюро ячэек МОПР'у.

Модус—1 дэл. на 50 членаў МОПР'у—чытачоў мопраўскай літаратуры.

МЕНАКРУГКОМ МОПР'у.

СЕНЬНЯ, 20 студзеня, а 7 гадз. увечары у доме Культуры адбудзецца

СХОД РАБОЧЫХ БРЫГАД

па агляду рабочай кваэрацыі, сумесна з кваэрактызам

ПАРАДАК ДНЯ: 1. Аб задачах агляду рабочай кваэрацыі.

Яўка рабочых брыгад, упаўнаважаных ЦРК, кваэрактыву, лавочных камісій—абавязкова.

ЦК ПСБ Праўленьне Менсэрабкоопа.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЕНЬНЯ

— Райпраўленьне шэф. т-ва Кастрычніцкага раёну. А 7 гадз. увеч. у памяшк. Кастрычніцкага РК КП(б)Б склікаецца інструкцыйная нарада шэфактыву. Будзе абмяркоўвацца правядзеньне веснавой сяўбы. Яўка абавязкова пад адказнасьць старшынь выканбюро.

— Дом Працасьветы. А 6½ гадз. увеч. адбудзецца стрэльбішча камсамольцаў школьнай і дашкольнай цэх. ячэйкі калектыву Працасьветы. Яўка абавязкова.

Расп. бюро АРУ. А 6½ гадз. увеч. у памяшк. АРУ адбудзецца чарговае пасяджэньне расп. бюро АРУ. Запрашаецца актыў АРУ.

— Агульна - гарадзкі сход членаў саюзу працмастацтва адбудзецца сёньня а 12 гадз. удзень у памяшканьні **Беддзяржтэатру.** Даклад аб задачах мастацтва ў рэканструкцыйны пэрыяд эробіць старшыня ЦК саюзу тав. Баярскі. Будзе заслухана інфармацыя аб пастановах 2-га пленуму ЦК саюзу ПМ. Уваходвольны для ўсіх.

ЗАЎТРА

— Саюз Працмастацтва. А 12 гадз. дня ў памяшканьні кіно «Інтэрнацыянал» адбудзецца раніннік для ўсіх членаў саюзу працмастацтва. Раніннік прысьвечаны ленінскім дням.

— Дом Камасьветы паведамляе, што заняткі антырэлігійнага сэмінара спыняюцца да 10 лютага г. г.

АД ПАРТТРОЙКІ ЦКК КП(б)Б

На пасяджэньне парттройкі ЦК КП(б)Б, якое адбудзецца 27 студзеня г. г. а 6½ гадз. увеч., выклікаюцца наступныя т. т.: **Міхневіч** Аляксей Міхасеў (Грэскі раён); **Ніканчык** Алесь Ігнатавіч (Чэрвеньскі раён); **Улюченак** Пятро Вінцэсаў (Менская арг.); **Ламініноўскі** Савелій Мээравіч (Менская арг.); **Халькоў** Макар Яўменавіч (Круглянскі раён); **Гайкоў** Андрэй Андрэявіч (Менская арг.); **Барысэвіч** Якуб Міхасеў (Менская арг.); **Аляксеў** Ільля Мэндалевіч (Віцебская арг.).

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

Паведамляю праз газэту, што з 15 га студзеня г.г. я спыняю прыватную практыку. Прафэсар В. МРАНГОВІЎС.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА" Ад аўторка, 21 студзеня

ГІСТАРЫЧНЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

ДАРОГА Ў СЬВЕТ

Сцэнары—М. БЛЕЙМАН. Апэратар—МІХАЙЛАЎ.
Рэжысэр— Б. ШПІС. Мастак—С. МЕЙКІН.

У галоўных ролях: В. Салаўцоў, А. Заржыцкая і інш.

ПРАЛЕГ 1901 г.

Усё яшчэ пятнаццаць гандлёва-прамысловых крызіс. Выкінутыя на вуліцу дзесяткі і сотні тысяч рабочых на могуць адшукаць сябе працы.

ЛЕНІН—1901 г., 1905 г., 1910 г., 1914 г., 1917 г., 1919 г.

Звыш праграмы КІНО ХРОНІКА САВКІНО № 1:

Правал імпэрыялістых на Кітайска-Усходняй чыгунцы. Святкаваньне каляд на фабрыцы ў Ленінградзе. Трактарныя калёны, ударнікі. На варце марскіх межаў.

Пачатак роўна а 7 гадз. Каса ад 5 гадз.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"

З ПАНЯДЗЕЛКА, 20 СТУДЗЕНЯ, ГІСТАРЫЧНЫ ФІЛЬМ З ПРАЛЁГАМ

ДОМ на ВУЛЬКАНЕ

Сюжэт—А. Фоляна. Сцэнары—Бэн-Назараа. Мастак—А. Ганчароні.
Рэжысэр—А. Масі.

ГАЛОЎНЫЯ РОЛІ ВЫКОНВАЮЦЬ

Алейнік Катэ—Д. Кіліані. Нафтарпамысловца—тав. Айвазян.
Матальнік Петрас—Грачыня. Старшы прыганяты—М. Каракаш.
Чорнарабочы Ахмэд—А. Алейнікераў. Кавалер—Уладзімер—А. Шыраз.

Фільм прысьвечаны бакінскаму пралетарыяту і яго гераічнай барацьбе ў часе рэакцыі 1907-8 г.

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ КУЛЬТУРФІЛЬМ

ВЫТВОРЧАСЬЦЬ АЛОЎКАЎ.

Пачатак 1 сэансу а 7 гадзіне увечары.

Каса адчынена ад 5 гадз.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"

З панядзелка, 20 студзеня | Новы савецкі фільм *вытворч. Арменкіно.*

16-ТЫ

(Шаснаццаты)

у 6-ці частках

У галоўных ролях: Каломенскі, Валхоўскі і інш.

Звыш праграмы | **За сацыялістычную вёску** часопіс Саўкіно № 2.

1. 1917-ты год. Ленінград. Смольны—баявы штаб Кастрычніка.
2. УССР. На будаўніцтва магутнай гідраэлектрастанцыі Дняпрабуду.
3. Сярэдняя-Волжая вобласьць—на месцы былога Чагрынскага манастыра арганізаваўся калгас «Позьмя Рэвалюцыі».

Пач. 1-га сэансу а 7 гадз. увеч. | Каса адчынена ад 5 гадз. увеч.

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

Па ЛЛЭ-дэ ВЭГА

Чацьвер, 23 студзеня адкрыты спэктакль **АВЕЧАЯ КРЫЦЦА.**

Білеты штодзённа ў рабкасе і ў касе тэатру. Пачатак а 8 гадз. 30 м.

Кіно „СПАРТАК"

АД ПАНЯДЗЕЛКА, 20 студзеня, 2 ПРАГРАМЫ 2

У адзін сэанс:

1) НАРАДЗІЎСЯ ЧАЛАВЕК драма ў 9 част.
У ГАЛ. РОЛІ народны артыст рэспублікі МАСКВІН.
2) Вясёлая амэрык. камэдыя ЦЁМНЫ КАНЁК.

ПАЧАТАК 1-га сэансу а 6 г. 30 м. Каса—ад 5 г.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „ЮНЫ ПІЯНЭР"

З ПРЫЧЫНЫ ВЯЛІКАГА ПОСЬПЕХУ

яшчэ 3 дні — 20, 21 і 22 студзеня

Рэвалюцыйны бытавы фільм

ГЭРОІ ДОМНЫ

У 7 частках.

У гал. ролі: І. ШТРАУХ, В. КАРАЛЁВА.

ШТОДЗЕННА 2 СЭАНСЫ.

Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м.

Каса адчынена ад 12 гадз. дня.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

У КОЖНЫМ КЛЮБЕ І ЛЕНІНСКІМ КУТКУ, У КОЖНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ ШКОЛЕ ПАВІННЫ БЫЦЬ ГЭТЫЯ КНІГІ

ЛІТАРАТУРА ДА ЛЕНІНСКІХ ДЗЁН

У. І. Ленін—„Аб сусьветнай вайне" БДВ, Менск, 1927 г. Цана—5 к.
„Аб міжнародным становішчы, аб вайне і Чырвонай Арміі" БДВ, Менск, 1927 г. Цана—2 к.
„Задачы Саюзаў моладзі" БДВ, Менск, 1 27 г. Цана—5 к.
Н. Ленін (У. І. Ульянаў)—„Новая эканамічная палітыка" БДВ, Менск, 1926 г. Цана—10 к.
„Аб харчовым падатку" БДВ, Менск, 1926 г. Цана—1 к.
У. І. Ленін—„Збор твораў том III" 1900-1903 г. БДВ, Менск, 1929 г. Цана—1 р.
Наўлянскі—„Ленін і каапэрацыя" БДВ, Менск, 1928 г. Цана—2 к.
Н. Крупская—„Пра Ўладзіміра Ільліча" БДВ, Менск, 1925 г. Цана—2 к.
Сталін—„Пытаньні Ленінізму" БДВ, Менск, 1928 г. Цана—1 р.
„Мысьлі Ў. І. Леніна аб эканамічнай палітыцы" БДВ, Менск, 1925 г. Цана—1 к.
Яраслаўскі—„Жыцьцё і праца Леніна" БДВ, Менск, 1927 г. Цана—50 к.
Дзьвінскі—„Як Ленін кіраваў Кастрычн. паўстаньнем" БДВ, Менск, 1929 г. Цана—8 к.
Кержанцаў—„Ленінізм" (Уводзіны ў вывучэньне Ленінізму) БДВ, Менск, 1926 г. Цана—50 к.
П. Кержанцаў і А. Леонцьеў—„Азбука Ленінізму" БДВ, Менск, 1929 г. Цана—1 р. 30 к.
Ольховы—„Азбука Ленінізму" (для вясковых партшкол і самаадукацыі) БДВ, Менск, 1929 г. Цана—25 к.

Прадаюцца ва ўсіх кнігарнях і аддзяленьнях БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

РАСПАЧАТА ПАДПІСКА НА 1930 г.

Вы ўжо спазьніліся падпісацца на педагагічную часопісь

„АСЬВЕТА"

Замест «АСЬВЕТЫ» будзе выдавацца масавая пэдагагічная і палітычна-асьветная часопісь

КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ

Часопісь «КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ» вядзе ваяўнічую барацьбу за камуністычнае выхаваньне працоўных мас, жыва адгукаецца на ўсе палітычныя, пэдалёга-пэдагагічныя, палітасьветныя праблемы дня.

Часопісь «КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ» зьвяцца лепшым памочнікам у рабоце настаўніка, палітасьветніка, дашкольніцы.

Часопісь «КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ» будзе выходзіць пры удзеле лепшых марксыцкіх сіл як Беларусі, так і інш. Саюзных Рэспублік.

Умовы падпіскі на 1930 год.

На 1 год (12 нумароў)	8 руб.
» паўгода (6 нумароў)	4 руб. 50 кап.
» 3 м-цы (3 нумары)	2 руб. 30 кап.
Кошт асобнага нумару	— 80 кап.

Скідка 25% паводле агалошанай цаны дасцца настаўнікам школ, хатнікам і інш., якія выпісваюць часопісь за свой кошт на цэлы год. Раённым установам (Райвыканкам, мясцком) ск дка 25% у тым выпадку, калі яны падпішуцца ня менш, як на 50 экзэмпляраў на цэлый год.

Падпіска прымаецца рэдакцыяй: Менск, Пляц Волі, 23|2, а таксама поштай і аддзяленьнямі Белдзяржвыдавецтва.

Усе, хто падпісаўся на часопісь «Асьвета» на 1930 год, будуць атрымліваць без асобнай даплаты—часопісь «Камуністычнае выхаваньне»

Сьпяшайцеся з падпіскай на часопісь «КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ»

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА" звяраце па тэл. 7-81

У ВЫПАДКУ НЕАТРЫМАНЬНЯ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА" звяраце па тэл. 2-49

50 к. кошт публікацыі аб згубе дакумента

ІЛЬНА-ПЯНЬКОВАМУ ТРЭСТУ ВСНГ БССР

ПАТРАБУЮЦЦА:

1) **аграномы-ільнаводы**, 2) **аграномы-эканамісты**, 3) **аграномы-мэліяратары**, 4) **аграномы-культуртэхнікі**, 5) **гідратэхнікі**, 6) **мэханікі і трактарыстыя.**

ЗАРПЛАТА—ПА ЗГОДЗЕ.

Заявы з кароткім жыцьцяпісам і паказаньнем стажу накіроўваць па адрасе: Менск, пляц Волі, № 21-1, ільна-пяньковаму трэсту.

ЗАВОЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛЬТЭРЫІ

Курсы рыхтуюць работнікаў для ніззавых кваэрацыйных арганізацый, крэдытных таварыстваў, арцеляй усіх відаў, калгасаў, саўгасаў і г. д.

Тэрмін навучаньня 8 месяцаў.

Прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 4 груп самігодзі. Прыём адбываецца круглы год.

Скончыўшыя курсы атрымліваюць адпаведныя пасьведчаньні.

Плата за курс 33 руб. разбіваецца так: 9 руб. пры паступленьні, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8 месяц і па 4 руб. штомесячна у па чатку кожнага навучальнага месяцу. Умова: прыёму высылаюцца за 2 дзесяцікапэйчаныя маркі.

Грошы пераводзяцца на адрас: Менск, Усекабанк, бяг. рахунак № 68... Усю карэспанденцыю накіроўваць: Менск Усекабанк, Завочным курсам.

Бел. к-рай саўгандальфлёту

ЗГУБЛЕНЫ пасьведчаньні і аб окладзе плацяжы: 1) № 57931 па адрасу Менск-Слуцк № 40904 на суму 114 р. 99 к., 2) № 58524 па адрасу Менск-Ярцава № 35212 на суму 3.5 р. 75 к., 3) № 12624 па адрасу Менск-Слуцк № 38.1 на суму 34 р. 78 к., 4) № 41877 па адрасу Менск-Асіповічы № 2791 на суму 40 руб. 35 к. Лічыць несапраўднымі

Бесьтыя... аплады энэргічны

ГАЛОЎБУХ

хоча з пляц месца

Горад, Акадэмія В. І. Вазьлоўскаго.

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск. Менск, Галоўлітбаз № 337.